WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

17 сакавіка 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 49 (26913)
Кошт 650 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РЫБАЦКАЕ ШЧАСЦЕ: «ВЯСНА КЛЮНУЛА!»

Сямейная захапленне падлёдным ловам на канале каля вёскі Сёмкава Мінскага раёна.

«ЭКАНОМІЛІ» НА ХВОРЫХ

У Мінскім гарадскім клінічным анкалагічным дыспасэры выяўлены крадзеж дарагіх прэпаратаў

Пад падазрэнне, паводле звестак прэс-афіцэра Першамайскага РУУС Вольгі Куцько, трапілі медсястра і старшая медсястра аднаго з аддзяленняў установы аховы здароўя. Увогуле выкрадзена лекаў на суму не менш як 59 мільёнаў рублёў. Мяркуецца, што падазроныя, якія атрымлівалі дарагія медпрэпараты, пры ўвядзенні іх хворым свядома змяншалі дозы: такім чынам і атрымліваліся «лішкі».

Падчас вобыску ў медсястры была знойдзеная і канфіскаваная партыя дарагіх прэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў, якія раней паступілі ў анкадыспансэр для лячэння хворых. Да таго ж у жанчыны знайшлі і буйную суму наяўных грошай, якія, як мяркуецца, яна атрымала за партыю выкрадзеных лекаў. Праваахоўнікамі ўжо высветлена, што «зэканомленыя» прэпараты рэалізоўваліся праз наладжаную сетку пасрэднікаў у краіны Садружнасці. Адметна, што кошт некаторых прэпаратаў на «чорным рынку» даходзіў да 6,5 мільёна рублёў за ўпакоўку. Следства працягваецца.

У МІНЧАНІНА СКРАЛІ $130 000

Невядомы зладзюжка скарыстаўся тым, што гаспадара не было дома, забраўся ў чужую кватэру, адкуль і выкраў вялікія грошы.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, няпрошаны госць завітаў у кватэру 32-гадовага мужчыны на вуліцы Захарава днём: каб патрапіць у жыллё ён выбіў стрыжань замка ўваходных дзвярэй. Праваахоўнікі вышукваюць злодзея, які ў выніку «візіту» пабагацеў адразу на 130 тысяч долараў ЗША. Буйная сума грошай у гэты ж дзень знікла і з прыватнага дома 37-гадовай мінчанкі на вуліцы Ярашэвіцкай, да якой у жыллё нехта забраўся, адціснуўшы шклопакет. Пацярпелая паведаміла міліцыі, што злачынца забраў з сабой 10 тысяч долараў ЗША і 9 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ: **Падрабязнасці**

«У МІНСКУ ПРЫНЯТЫЯ ПРЫНЦЫПОВЫЯ РАШЭННІ»

СУМЕСНЫ разгорнуты адказ на шэраг актуальных для Беларусі, Расіі і Казахстана пытанняў далі 15 сакавіка на прэс-канферэнцыі кіраўнікі ўрадаў гэтых краін. Яны таксама падвялі вынікі пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы і Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці — Вышэйшага органа Мытнага саюза.

Надзеі апраўдаліся

Як было заяўлена ў Мінску напярэдадні, Беларусь чакае канкрэтных рашэнняў па Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). Звестак аб тым, ці спраўдзіліся гэтыя надзеі, інфармацыю аб рашэннях, прыняцце якіх павінна паскорыць стварэнне эканамічнай прасторы трох дзяржаў, нам, беларускім, расійскім і казахстанскім журналістам, прыйшлося чакаць даволі працяглы тэрмін. Выніковая прэс-канферэнцыя была запланавана прыкладна на палову восьмай вечара, але па нейкіх прычынах выхад да прэсы кіраўнікоў урадаў зацягваўся. У канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі сярод прадстаўнікоў СМІ папаўзлі чуткі, што, маўляў, узніклі спрэчкі, нечаканыя праблемы, і прэм'еры не могуць прыйсці да згоды, таму пакуль няма чаго істотнага сказаць прэсе...

Кіраўнікі ўрадаў з'явіліся каля мікрафонаў толькі без дваццаці адзінаццаць вечара. Міхаіл Мясніковіч заявіў, што прынятыя на Саюзным Саўміне і Міждзяржаўным савеце рашэнні сур'ёзныя і грунтоўныя. Яны, у прыватнасці, дапамогуць Беларусі і Расіі значна прасунуцца па шляху эканамічнага развіцця, павялічыць аб'ём узаемнага гандлю, дасягнуць істотнага паляпшэння інвестыцыйнага і інавацыйнага супрацоўніцтва.

Нагадаем, на разгляд Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы было вынесена 27 пытанняў. У прыватнасці, удзельнікі пасяджэння абмеркавалі вынікі выканання плана сумесных дзеянняў урадаў краін па мінімізацыі наступстваў фінансавага крызісу, паляпшэнні параметраў плацежнага балансу, удасканаленні ўмоў вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці і ўзаемнага гандлю, вынікі ўзаемнага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў 2010 годзе, Праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі, вынікі выканання плана стварэння аб'яднаннай транспартнай сістэмы Саюзнай дзяржавы на 2008—2010 гады.

СТАР. 2

Бурыя мядзведзі адабралі ежу ў трох бізнэсменаў

Два бурыя мядзведзі прымусілі ўцякаць трох мінскіх бізнэсменаў прыкладна за 3 км ад Ашмян (Гродзенская вобласць), паведамляе БЕЛТА.

Маладыя людзі вырашылі перакусіць у адной з альтанак на ўзлеску. Расклаўшы на стале ежу, яны ўбачылі, як з лесу выйшлі два бурыя мядзведзі і накіраваліся да іх. Мінчане кінуліся да машыны, добра, што за рулём знаходзіўся вадзіцель. Ад'язджаючы, бізнэсмены заўважылі, як мішкі лапамі змахнулі са стала хлеб, каўбасу, садавіну і пачалі іх есці.

Раней адзін з жыхароў Ашмян бачыў двух бурых мядзведзяў за паўкіламетра ад горада. Іншыя жыхары раёна напярэдадні зімы знайшлі ў Граўжышкаўскім лесе сляды мядзведзіцы і двух яе дзіцянят. А нядаўна нарыхтоўшчыкі дроў бачылі трох медзведзянят каля в. Кемелішкі Астравецкага раёна. Паводле слоў работнікаў лясной гаспадаркі, мядзведзі на Гродзеншчыне з'явіліся некалькі гадоў таму. Дзіўна, але некаторыя таптыгіны майструюць на зіму бярлогі паблізу сельскіх населеных пунктаў.

Ва Урадзе

Цэны на цукар расці не будуць...

ПРА гэта заявіў журналістам старшыня канцэрна Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка пасля заканчэння пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім сярод іншых пытанняў разглядалася і развіццё харчовай прамысловасці краіны.

Паводле слоў кіраўніка канцэрна, цэны на цукар ужо дасягнулі свайго піку на сусветным рынку, паколькі былі неўраджаі ў многіх краінах, асабліва ў Бразіліі, Індыі. Цяпер на сусветным рынку з'явіліся новыя рэсурсы. «Таму, мяркуем, прыросту цэн на цукар не павінна быць», — зазначыў ён.

СТАР. 2

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СлуцкОблГарант» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже здания радиотелевизионной мастерской, об. пл.109.0 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Солигорский р-н, г.п. Красная Слобода, ул. Слуцкая, д. 16.**

Начальная цена с НДС (снижена) – 34 053 884 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,0765 га.

Задаток 10 % от начальной цены.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.01.2011.

Аукцион состоится **31.03.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.03.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

На слыху

ТОКІА ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў «ГОРАД-ЗДАНЬ»?

На фоне паведамленняў пра павышэнне ўзроўню радыяцыі напалоханыя жыхары сталіцы Японіі пачалі масавы зыход. У міжнародным аэрапорце Токіа сабраліся чэргі ахвотнікаў паляцець далей, прычым многім усё адно куды накіроўвацца — былі б квіткі. З-за радыелагічнай пагрозы ў Японіі пачалі зачыняць свае філіялы і эвакуяваць супрацоўнікаў буйныя еўрапейскія і сусветныя кампаніі. Для эвакуацыі фрахтуюць самалёты прыватных кампаній, пытанне кошту нават не хвалюе. Гэта ўжо прывяло да таго, што цэны на пералёт падскочылі мінімум на чвэрць. Эвакуацыя авіятранспартам, як і аўтамабілямі, ускладняецца тым, што вычэрпваюцца запасы паліва. Пры гэтым чэргі ў аэрапортах толькі даўжэюць. Токіа, дзе заўсёды бурліла жыццё, цяпер нібы вымер. Школы зачынены, шматлікія прадпрыемствы адпусцілі супрацоўнікаў дадому. Жыхары аддаюць перавагу заставацца дома, загадзя зрабіўшы запасы прадуктаў і іншых неабходных рэчаў. Няма нават машын, якія раней запаўнялі такійскія магістралі шчыльным струменем. Чакаючы распаўсюджвання радыяцыі, людзі асцерагаюцца кожнага подыху ветру.

«У МІНСКУ ПРЫНЯТЫЯ ПРЫНЦЫПОВЫЯ РАШЭННІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта будзе бяспечная АЭС

У рамках візіту ў Мінск старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна адбылося падпісанне чатырох міжнародных дакументаў паміж Беларуссю і Расіяй: аб супрацоўніцтве ў будаўніцтве на тэрыторыі нашай краіны атамнай электрастанцыі; аб некаторых мерах па забеспячэнні паралельнай работы аб'яднанай энергетычнай сістэмы Беларусі і адзінай энергетычнай сістэмы Расійскай Федэрацыі; аб супрацоўніцтве ў галіне даследавання і выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Таксама была дасягнута дамоўленасць паміж беларускімі Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, Міністэрствам аховы здароўя, Міністэрствам фінансаў і расійскім міністэрствам аховы здароўя і сацыяльнага развіцця аб выкарыстанні двухбаковай дамоўленасці аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння ад 24 студзеня 2006 г. Такая вось цікавая фармулёўка пагаднення.

Але больш за ўсё гаварылі аб дакументе, які тычыўся будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі. Паводле слоў Уладзіміра Пуціна, гэта будзе бяспечная АЭС. Ён пракаментаваў сітуацыю на АЭС Японіі. Тое, што там здарылася, Уладзімір Пуцін ахарактарызаваў як «збег акалічнасцяў». Разам з тым, ён звярнуў увагу на тое, што на японскіх АЭС працавала абсталяванне 40-гадовай даўнасці, блокі 70-х гадоў. А зараз у свеце выкарыстоўваюцца куды больш надзейныя сучасныя блокі з новымі сродкамі абароны, якія зводзяць да мінімуму магчымыя аварыі. Менавіта такая АЭС апошняга пакалення будзе пабудавана ў Беларусі, узровень абароненасці на ёй будзе значна вышэйшы, чым на цяперашніх АЭС Японіі, сказаў расійскі прэм'ер.

Пагадненне аб крэдытаванні Расіяй узвядзення АЭС мяркуецца падпісаць на працягу месяца. Уладзімір Пуцін на прэс-канферэнцыі ўдакладніў, што аб'ём крэдытаў будзе залежыць ад аб'ёму таго абсталявання, якое краіна-заказчык вырабляе або не вырабляе сама. Для Беларусі гэты аб'ём можа скласці недзе 6 млрд дол. ЗША. Старшыня расійскага ўрада таксама закрануў тэму верагоднага крэдытавання інфраструктуры будучай беларускай АЭС. Хоць, па яго словах, выдаткі на інфраструктуру звычайна бярэ на сябе краіна-заказчык, але для Беларусі, магчыма, будзе зроблена выключэнне.

Справы аўтамабільныя

У час візіту Уладзіміра Пуціна, яго перамоў з беларускім калегам у Мінску, натуральна, было закранутае вельмі актуальнае сёння для насельніцтва абедзвюх краін аўтамабільнае пытанне. На погляд Міхаіла Мясніковіча, пры яго вырашэнні, дакладней, вызначэнні ўвазных мытых пошлін на аўтамабілі ў рамках Мытнага саюза, Беларуссю і Расіяй вытрыманы баланс інтарэсаў. Увогуле Міхаіл Мясніковіч лічыць, што гэтая праблема вырашана з улікам усіх плюсаў і мінусаў. Па яго словах, мы тут дзесьці прайграем, дзесьці выйграем.

Выказаўся на аўтамабільную тэму і Уладзімір Пуцін. На яго думку, узровень мытнай абароны па адзіным мытным тарыфе і ўзровень мытнай абароны, які абумоўлівае Расія, амаль ідэнтычныя і ніяк не паўплываюць на стан унутранага рынку. «Мы дамовіліся з нашымі партнёрамі, што будзем ажыццяўляць абарону нашага агульнага рынку пры завозе тэхнікі імпартнай вытворчасці. Беларусь зацікаўленая ў тым, каб трымаць вызначаны тарыф па грузавых аўтамабілях, а мы зацікаўленыя трымаць вызначаны тарыф па легкавых», — сказаў Уладзімір Пуцін. Ён таксама лічыць станоўчым маючае адбыцца аб'яднанне актываў вядомых вытворцаў аўтамабільнай тэхнікі МАЗа і КамАЗа. Гэта, на яго погляд, спрыяла б павышэнню канкурэнтаздольнасці беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў.

Мытны саюз адбыўся

Гэты тэзіс неаднойчы паўтарыў падчас прэс-канферэнцыі прэм'ер-міністр Казахстана Карым Масімаў. Ён заявіў, што прыняты сур'ёзныя рашэнні па ўрэгуляванні некаторых тэхнічных шурпатасцяў па пытанні пераносу мытнай мяжы на знешнія контуры Мытнага саюза. Кіраўнік урада Казахстана паведаміў, што таксама было абмеркавана адчувальнае пытанне і знойдзена прынцыповае ўзгодненае рашэнне па ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (СГА). «Няма перашкод для нашага наступнага руху наперад», — выказаў упэўненасць Карым Масімаў. Ён, дарэчы, падзякаваў беларускаму боку за выдатную арганізацыю работы пасяджэння ў Мінску Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці.

Мне здалося, што прэм'еры з задавальненнем гаварылі аб зробленым у Мінску для хутчэйшага стварэння АЭП. У прыватнасці, паведамілі, што на пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці былі абмеркаваны падыходы да кадыфікацыі заканадаўства Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, да адзінай міграцыйнай (візавай) палітыкі (правілаў) у стаўленні трэціх краін, удасканалення дзейнасці наднацыянальных органаў, у тым ліку арганізацыі дзейнасці Камісіі Мытнага саюза, фарміравання і арганізацыі дзейнасці Суда Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Былі таксама разгледжаны пытанні аб пераносе транспартнага кантролю з беларуска-расійскай мяжы на знешні контур Мытнага саюза і пераносе кантролю з расійска-казахстанскай мяжы на знешнюю мяжу Мытнага саюза.

Па правілах Сусветнай гандлёвай арганізацыі

Як Мытны саюз і Адзіная эканамічная прастора будуць спалучацца з імкненнем трох дзяржаў далучыцца да Сусветнай гандлёвай арганізацыі? Гэта пытанне стала адным з самых актуальных падчас прэс-канферэнцыі. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Мытны саюз павінен стаць рэальным сусветным эканамічным цэнтрам, які будзе вельмі прывабны для іншых дзяржаў. У сваю чаргу Уладзімір Пуцін падкрэсліў: Мытны саюз і АЭП будуюцца на прынцыпах СГА, у гэтым іх вялікія перавагі. Таму няма вялікага значэння ў тым, якая з краін-удзельніц Мытнага саюза першай уступіць у СГА. Гэта ніякім чынам не адаб'ецца на эканоміках дзвюх іншых краін. Таму што Мытны саюз з самага пачатку быў заснаваны на прынцыпах СГА, яшчэ раз звярнуў увагу Уладзімір Пуцін.

А каб краіны-ўдзельніцы Мытнага саюза адчувалі сябе больш упэўнена на міжнародных рынках, кіраўнікі іх урадаў дамовіліся праводзіць рэгулярныя кансультацыі па злабадзённых пытаннях фінансавай і эканамічнай сітуацыі ў розных рэгіёнах свету, паведаміў прэм'ер-міністр Казахстана Карым Масімаў. Міхаіл Мясніковіч выказаў упэўненасць у тым, што стварэнне наднацыянальнага органа Мытнага саюза — Камісіі — з'яўляецца нармальным працэсам і будзе спрыяць развіццю адносін з яго партнёрамі.

Сігнал Украіне

З Мінска 15 сакавіка вуснамі старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна быў пасланы ясны, дакладны і не вельмі прыемны сігнал афіцыйнаму Кіеву. У час яго адказу на пытанне аб супрацоўніцтве з Украінай пасля стварэння Адзінай эканамічнай прасторы расійскі палітык адзначыў, што далучэнне Украіны да Мытнага саюза зрабіла б інтэграцыйныя працэсы ў ім больш паўнацэннымі. Але Украіна імкнецца ў Еўрасаюз, вядзе перамовы з Брусэлем аб стварэнні зоны свабоднага гандлю. Пры гэтым узровень мытнай абароны, які абмяркоўвае Украіна, будзе больш чым удвая ніжэйшы, чым адзіны мытны тарыф Беларусі, Расіі і Казахстана. На практыцы гэта значыць, растлумачыў Уладзімір Пуцін, што ў выпадку стварэння такой зоны з ЕС Украіна будзе вымушана саступіць па шматлікіх адчувальных пазіцыях для сваёй эканомікі. Украіне цяжка будзе разлічваць на актыўны продаж яе тавараў у краінах Еўрасаюза. І вельмі праблематычна, як даў зразумець старшыня ўрада, што гэтыя плыні тавараў знойдуць пакупніка ў Расіі, Казахстане і Беларусі. «Мы не можам гэтага дазволіць і будзем вымушаныя выбудоўваць мяжу, інакш нас заваляць гэтымі таварамі, — рашуча заявіў Уладзімір Пуцін і дадаў: — Не трэба быць экспертам, каб убачыць, што наступствы гэтага кроку будуць цяжкімі для Украіны».

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ірландыі Мэры Макаліс

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ірландыі Мэры Макаліс і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём Святога Патрыка.

«Шчыра спадзяюся, што сяброўскія адносіны паміж Беларуссю і Ірландыяй будуць і ў далейшым развівацца ва ўсіх сферах на карысць народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПАСЛЯ ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРАМ У СЯННО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ-ІНВАЛІДАЎ КУПЯЦЬ АЎТОБУС

Сенненскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання ў 2012 годзе атрымае доўгачаканы спецыяльны аўтобус, прызначаны для перавозкі інвалідаў. Пытанне аб набыцці транспарту паспяхова вырашылася пасля прыёму грамадзян, які ў лютым у Сянно правёў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль ТОЗІК, расказала БЕЛТА намеснік старшыні Сенненскага райвыканкама Зоя Фаміна.

Сярод грамадзян, якія прыйшлі на прыём, была жанчына, якая разам з мужам выхоўвае дзіця-інваліда. Яна расказала віцэ-прэм'еру аб тым, што з-за адсутнасці спецыялізаванага аўтатранспарту дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі не могуць наведваць карэкцыйна-развіваючы цэнтр, заняткі ў якім прыносяць вялікую карысць хворым дзецям. Як пацвердзіла намеснік старшыні райвыканкама, гэта праблема актуальная для раёна. Каля 50 дзяцей-інвалідаў маюць патрэбу ў карэкцыйна-развіваючым навучанні. Не ва ўсіх бацькоў ёсць магчымасць прывозіць дзяцей на асабістым транспарце, а прыехаць на грамадскім дзецям не дазваляе фізічны стан. На набыццё спецыялізаванага аўтобуса неабходна больш як Br100 млн, якіх мясцовы бюджэт не мае. Паводле слоў Зоі Фаміной, гэты аўтобус можа выкарыстоўвацца не толькі для перавозкі дзяцей-інвалідаў, але і дарослых людзей з абмежаванымі магчымасцямі, для якіх у раёне адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання. Анатоль Тозік узяў вырашэнне гэтай праблемы на асабісты кантроль, і вось цяпер райвыканкаму стала вядома, што ў 2012 годзе за кошт рэспубліканскага бюджэту для Сенненскага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання будзе набыты аўтобус. На прыём да намесніка прэм'ер-міністра прыйшлі дзевяць чалавек. Большасць з іх узнімалі надзённыя пытанні, якія былі вырашаны ў рамках дзеючага заканадаўства.

Цэны на цукар расці не будуць...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падводзячы вынікі работы харчовай прамысловасці за мінулую пяцігодку, Іван Данчанка падкрэсліў, што краіне ўдалося забяспечыць харчовую бяспеку па стратэгічных напрамках і стварыць шэраг канкурэнтных імпартазамяшчальных вытворчасцяў. Сёння рэспубліка цалкам забяспечвае сябе цукрам, практычна адсутнічае імпарт тытунёвых вырабаў, на піўны рынак прыцягнутыя стратэгічныя інвестары, што дазволіла мінімізаваць імпарт гэтага напою і наладзіць вытворчасць ліцэнзійных гатункаў піва на тэрыторыі краіны.

Разам з тым, дасягнуты харчовай галіной узровень не ў поўнай меры адпавядае патрабаванням сённяшняга часу, рэзервам, якія ёсць, і магчымасцям як па павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці з мэтай нарошчвання экспарту, так і замяшчэння імпарту ўнутры краіны. Іван Данчанка паведаміў, што на пасяджэнні ішла гаворка аб падваенні экспарту, больш поўнай загрузцы магутнасцяў і стварэнні новых. «Задачы напружаныя, але рэальныя, — кажа ён. — Я лічу, што мы зможам істотна дабавіць за кошт рэалізацыі прадукцыі харчовай прамысловасці на экспарт, а таксама прыцягнення прамых інвестараў».

Адным з прыярытэтаў развіцця галіны ў наступныя пяць гадоў стане стварэнне новых вытворчасцяў, заснаваных на новых і высокіх тэхналогіях. Шэраг з іх будуць уведзеныя за кошт унутраных рэсурсаў, іншыя — з дапамогай прамых замежных інвестыцый. У прыватнасці, у мінулы аўторак быў падпісаны дагавор з нямецкай кампаніяй па будаўніцтве новага дражджавога камбіната да снежня будучага года ў Слуцку: аб'ём прамых інвестыцый складзе каля 25 мільёнаў еўра. Таксама актыўна вядуцца перагаворы па прыцягненні кітайскіх інвестыцый на будаўніцтва завода лімоннай кіслаты, разглядаецца пытанне будаўніцтва новага цукровага камбіната. Міншчына вядзе перагаворы з нямецкімі інвестарамі па развіцці Слуцкага плода-агародніннага камбіната. «Гэта значыць, патэнцыял ёсць, — падкрэсліў Іван Данчанка. — Тут патрэбныя і інвестары, і тавараправодная сетка, і новыя рынкі збыту. Урад такія задачы паставіў, будзем дзейнічаць».

Кіраўнік «Белдзяржхарчпрама» выказаў думку, што наша рэспубліка прывабная для інвестараў, якія гатовыя ўкладваць сродкі і ў кандытарскую галіну. Таму зараз актыўна абмяркоўваецца з украінскімі, фінскімі і нямецкімі кампаніямі будаўніцтва ў рэспубліцы новай кандытарскай фабрыкі. Паводле слоў Івана Данчанкі, Беларусь валодае высакаякаснай сыравінай для вырабу прысмакаў — шмат цукру, шмат малака, шмат пшаніцы. «Трэба толькі прывезці какаву, а астатняе мы маем», — канстатаваў ён. Між іншым, будуць нарошчвацца магутнасці і на іншых кандытарскіх фабрыках. Плануецца, што магутнасці ўжо дзейных прадпрыемстваў будуць павялічаныя ў паўтара раза. «Мы запрашаем сусветныя брэнды, каб можна было з беларускай сыравіны рабіць сапраўды якасныя брэндавыя вырабы», — дадаў Іван Данчанка.

Што ж датычыцца існуючай праблемы дэмпінгу ў кандытарскай галіне з боку ўкраінскіх вытворцаў, то з мэтай яе ўрэгулявання, паведаміў старшыня канцэрна, наша краіна разам з партнёрамі па Мытным саюзе вядзе перамовы з украінскімі калегамі. «Ва ўкраінскіх кандытараў ёсць элементы дэмпінгу, але ў рамках нормаў і правіл СГА гэтыя палажэнні будуць урэгуляваныя», — мяркуе ён.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 18 АПРЕЛЯ 2011 ГОДА ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Номер предмета торгов	№ 1	№ 2	№ 3
Наименование и характеристики продаваемого имущества	Помещение многофункциональное общей площадью 409,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708002864 (производственно-бытовое)	Помещение многофункциональное общей площадью 280,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-708002865 (производственное с адм. помещениями)	Склад (складское помещение) общей площадью 10,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-708002866
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 1	г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 2	г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 3
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск		
Балансодержатель	ОАО «Белзаводстрой»		
Начальная цена	601 250 000 белорусских рублей	418 640 000 белорусских рублей	13 950 000 белорусских рублей
Сумма задатка	60 000 000 белорусских рублей	40 000 000 белорусских рублей	1 300 000 белорусских рублей

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **18 апреля 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 18.03.2011 по 15.04.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок:

(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

Мінск і Маскву злучыць высакахуткасная чыгунка

Праз Беларусь можа прайсці высакахуткасная чыгунка, якая злучае Мадрыд, Парыж і Варшаву з Масквой. Для яе рэзервуецца спецыяльны калідор на тэрыторыі нашай рэспублікі. Непадалёк ад мікрараёна Шабаны мяркуецца будаўніцтва вакзала для новай чыгуначнай магістралі.

Вольга ЖАРЫНА, *«Мінск—Навіны».*

УНП 300042199

ОАО «НАФТАН» РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

- **а/м ЗИЛ 431410, 1994 г.в.**, начальная цена — 5 937 332 руб. РБ;
- **а/м ЗИЛ 431412, 1997 г.в.**, начальная цена — 6 373 493 руб. РБ;
- **трактор МТЗ-82, 1993 г.в.**, начальная цена — 6 743 242 руб. РБ;
- **трактор МТЗ-82, 1996 г.в.**, начальная цена — 6 736 731 руб. РБ.

Состояние — хорошее.

Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб, 101 с пометкой «В комиссию по реализации неиспользуемого имущества» (автотранспортные средства) до 13 апреля 2011 года. Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны:
8 (044) 758 08 33; 8 (0214) 55 79 07; 8 (0214) 55 78 66.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

«САПРАЎДНЫ ПАТРЫЁТ ПАВІНЕН ЖЫЦЬ ІНТАРЭСАМІ КРАІНЫ І ГРАМАДСТВА»

САПРАЎДНЫ патрыёт павінен жыць інтарэсамі краіны і грамадства. Такое меркаванне выказаў учора на ўрачыстым адкрыцці XIV Рэспубліканскай выстаўкі навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і дзіцячай творчасці «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне: вопыт і перспектывы» першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр РАДЗЬКОЎ, перадае БЕЛТА.

Наведваючы выстаўку, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта асабліва падкрэсліў, што ўсе планы і праекты педагогаў-арганізатараў па патрыятычным выхаванні павінны знаходзіць прымяненне ў грамадскім жыцці школ, ВНУ і іншых навучальных устаноў. «Без практыкі ніякія тэарэтычныя ўяўленні аб грамадзянскасці і патрыятызме не будуць увасоблены ў жыццё, не стануць масавымі, не будуць падтрыманы моладдзю», — лічыць Аляксандр Радзькоў. Ён адзначыў, што шырокае распаўсюджванне камп'ютарных тэхналогій, сеткі інтэрнэт зусім не выключае такіх арганізацыйных форм у рабоце з моладдзю як паходы, краязнаўчая работа, распрацоўка праектаў патрыятычнай тэматыкі.

На думку Аляксандра Радзькова, без жывога кантакту з ветэранамі, жыхарамі вёсак і гарадоў, пошуку інфармацыі моладзь не зможа спасцігнуць усіх глыбінь гістарычнай спадчыны Беларусі, зразумець і палюбіць яе традыцыі. Ён падкрэсліў, што любоў да Радзімы не можа быць толькі на словах, яна павінна праяўляцца ва ўчынках, канкрэтных прапановах, мерапрыемствах, акцыях.

У час работы выстаўкі адбудуцца майстар-класы па пытаннях арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання, прэзентацыі вопыту работы ўстаноў адукацыі, круглыя сталы. Таксама будуць прадстаўлены работы дзіцячай творчасці ўдзельнікаў агляду-конкурсу «Прывітанне, свет!» Тут жа пройдуць канцэрт-марафон творчых калектываў «Зямля бацькоў — жыцця крыніца», інтэрактыўная прэзентацыя «Выкарыстанне методыкі форум-тэатра ў арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі», прэзентацыя калекцый дзіцячага і маладзёжнага адзення «Мы — будучыня Беларусі».

Выстаўка будзе працаваць да 18 сакавіка.

Вячаслаў КУЎШЫНАЎ:

«Можна быць упэўненымі ў высокім узроўні бяспекі будучай АЭС, якая абавязкова будзе прааналізавана ў нас літаральна «да кончыкаў пазногцяў»

У сувязі з аварыямі на АЭС у Японіі, якія сталі наступствамі моцнага землятрусу, многіх беларусаў сёння асабліва хвалюе пытанне бяспекі ўласнай атамнай электрастанцыі, якая павінна з'явіцца ў нашай краіне.

— «Прымяраць» сітуацыю, якая склалася ў Японіі, на Беларусь няма ніякага сэнсу, — патлумачыў «Звяздзе» **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Вячаслаў КУЎШЫНАЎ**. — Па-першае, сам па сабе такі форс-мажор, як землятрус у 8,8 бала, у нас немагчымы, а па-другое, праект рэактара, які будзе прымяняцца ў нас, значна больш дасканалы. У Японіі будаваліся рэактары першага і другога пакалення, а ў нас будзе выкарыстаны праект новага пакалення «3+» з палепшанымі тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі, са спецыяльнымі пасіўнымі сістэмамі бяспекі і многім іншым.

Увогуле, да вырашэння праблемы бяспекі будучай АЭС наша краіна падыходзіць з выключнай адказнасцю. Пасля таго, як Беларусь атрымае праект атамнай электрастанцыі, Міністэрства энергетыкі, Дырэкцыя будаўніцтва АЭС і Дэпартамент па ядзернай энергетыцы прааналізуюць бяспеку станцыі ўнутры краіны. Такі парадак вызначыла МАГАТЭ. Прасцей кажучы, меры бяспекі, распрацаваныя Расійскай Федэрацыяй, якая праектуе рэактар, будуць перапраўвярацца нашымі беларускімі спецыялістамі, на нашых вылічальных машынах. У сувязі з гэтым у краіне цяпер праводзяцца работы па стварэнні спецыяльнай арганізацыі Technical Support Onirganization (Арганізацыі тэхнічнай падтрымкі). Менавіта ёй будуць перадавацца расійскія разлікі, якія мы будзем перапраўвяраць па цэлым шэрагу параметраў і кірункаў, што характарызуюць бяспеку станцыі. Гэтая арганізацыя будзе створана на базе нашага інстытута з задзейнічаннем ужо набытага намі суперкамп'ютара «Скіф-500». Гэта першы этап праверкі. Калі ўзнікнуць пытанні, то праект верцца аўтарам з адпаведнымі заўвагамі — для дапрацоўкі (гэта можа быць даволі доўгі працэс). Пасля таго, як усе нашы патрабаванні будуць задаволены, арганізацыя, якая стане ажыццяўляць эксплуатацыю станцыі, павінна атрымаць дазвол Дзяржатамнагляда (Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы). А для гэтага Дзяржатамнагляд павінен правесці сваю незалежную праверку. Яна таксама будзе ажыццяўляцца ўнутры краіны на вылічальных машынах нашага інстытута і нашымі ж спецыялістамі.

Для таго, каб мець адпаведны ўзровень спецыялістаў і машыннага парку ўнутры краіны, падрыхтавана спецыяльная праграма, якая прадугледжвае падрыхтоўку беларускіх спецыялістаў для адпаведных разлікаў у краінах ЕС. Спецыялісты, якія потым будуць працаваць у Арганізацыі тэхнічнай падтрымкі, папярэдне пройдуць усе неабходныя стажыроўкі пад кіраўніцтвам экспертаў Еўрапейскага Саюза па ўсіх патрэбных кірунках. Адсюль можна зрабіць выснову, што нашы ацэнкі, нашы экспертызы будуць на дастаткова высокім узроўні. Адпаведна можна быць упэўненымі ў высокім узроўні бяспекі будучай АЭС, якая абавязкова будзе прааналізавана ў нас літаральна «да кончыкаў пазногцяў».

Па ўсіх іншых сістэмах абсталявання станцыі, якое будзе паступаць да нас, нашымі спецыялістамі таксама будзе ажыццяўляцца абавязковая праверка, у тым ліку і з выездам на прадпрыемства-вытворцу.

Можна сказаць, што мы атрымаем дасканалую бяспечную ўстаноўку, якая зможа паспяхова эксплуатавацца на працягу прадугледжанага для яе часу. Наш інстытут распрацаваў праграму навуковага суправаджэння развіцця атамнай энергетыкі на Беларусі і ў рамках гэтай праграмы ажыццяўляе даследаванні па 10 кірунках, у тым ліку і ў кірунку мадэлявання работы абсталявання атамнай станцыі, што фактычна таксама ўяўляе сабой ацэнку бяспекі.

Інга МІНДАЛЁВА.

Акцыя «Дапаможам Японіі разам» стартавала ў Беларусі

БЕЛАРУСКАЕ таварыства Чырвонага Крыжа распачало акцыю па зборы грошай для пацярпелых японцаў. А Федэрацыя прафсаюзаў рэспублікі прыняла рашэнне адправіць у Японію гуманітарную дапамогу.

— Мы стварылі спецыяльны рахунак, на які ўсе ахвотныя могуць пералічыць грошы, — паведамілі ў Чырвоным Крыжы. — Пералічаныя сродкі пойдуць на закупку медыкаментаў, коўдраў, сродкаў асабістай гігіены, санітарнай ачысткі, пітной вады, медыцынскага абсталявання, адзення і інш. Чаму мы не збіраем рэчы? Справа ў тым, што японскі бок адмовіўся ад такой дапамогі. Ды і дастаўляць з Беларусі ў Японію рэчы будзе вельмі дорага. Таму мы збіраем грошы, каб пасля за іх закупіць неабходныя рэчы ў суседніх краінах.

Беларускія валанцёры Чырвонага Крыжа ў Японію не паедуць. Па словах **Дзмітрыя РУСАКОВА, галоўнага спецыяліста па падрыхтоўцы і рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі беларускага Чырвонага Крыжа,** гэта досыць дорага і не вельмі эфектыўна.

— Мы маем падрыхтаваных валанцёраў, аднак на такія далёкія адлегласці звычайна іх не пасылаем. Валанцёрскія атрады нашы разлічаны на бліжэйшае замежжа — Расію, Украіну, Літву, Латвію, Польшчу і г.д., — паведаміў ён.

Гуманітарную дапамогу японцам акажа Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. Рашэнне аб гэтым было прынята прэзідыумам Савета ФПБ 15 сакавіка. Дапамога будзе перададзена праз Японскую канфедэрацыю прафсаюзаў (Рэнго). Пакуль вывучаюцца магчымасці адпраўкі груза гуманітарнай дапамогі.

Па апошніх звестках, гуманітарную дапамогу Японіі прапанавалі 102 краіны, у тым ліку і нашы суседзі — Украіна і Расія. Расійскія выратавальнікі ўжо выехалі для аказання дапамогі.

Беларускія супрацоўнікі МНС пакуль ніякіх камандаў не атрымлівалі.

— У нас ёсць неабходныя спецыялісты і тэхніка, — паведамілі ў прэс-службе МНС. — Аднак рашэнне аб дапамозе прымаецца на высокім узроўні. Таму як толькі яно будзе, мы адразу зможам выехаць.

Згодна са звесткамі японскіх улад колькасць ахвяр на 16 сакавіка перавышае 4 164 чалавек. Агульная колькасць тых, хто загінуў і прапаў без вестак, складае больш за 12 тыс. чалавек

Настасся ЗАНЬКО.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ААН ПАПРАСІЛІ ДАЗВОЛІЦЬ КРОПКАВЫЯ ЎДАРЫ ПА ЛІВІІ

Праект рэзалюцыі па сітуацыі ў Лівіі, прапанаваны Савету Бяспекі ААН Францыяй, Вялікабрытаніяй і Ліванам, прадугледжвае нанясенне кропкавых удараў па Лівіі. Пра гэта ў сваім блогу напісаў міністр замежных спраў Францыі Ален Жупэ.

Як заявіў палітык, эканамічныя і палітычныя санкцыі, уведзеныя раней супраць рэжыму Муамара Кадафі, маюць сэнс, аднак яны падзейнічаюць толькі праз некалькі месяцаў.

Паводле слоў Жупэ, лівійскі дыктатар «парушыў баланс», кінуўшы супраць сваіх апанентаў дзясяткі самалётаў і верталётаў, якія могуць быць «нейтралізаваны» кропкавымі ўдарамі.

Менавіта таму, напісаў міністр, тры краіны прапанавалі СБ ААН праект рэзалюцыі, якая дасць мандат на правядзенне такіх удараў. Як адзначае BBC News, ЗША пакуль не вызначыліся з тым, ці падтрымліваць усталяванне над Лівіяй зоны, закрытай для палётаў. Расія таксама пакуль чакае ўдакладненняў ад Лігі арабскіх дзяржаў пра тое, на якія менавіта рэгіёны павінна распаўсюджвацца гэта зона. Германія выказала сумневы ў мэтазгоднасці яе ўсталявання.

WIKILEAKS ПРА КАТАСТРОФУ Ў ЯПОНІІ: УСЁ БЫЛО ВЯДОМА ЗАГАДЗЯ

Пра сур'ёзныя праблемы на японскіх АЭС было вядома яшчэ некалькі гадоў таму — гэтую краіну, у прыватнасці, папярэджвалі, што станцыі могуць не вытрымаць магутнага землятрусу. Ущечкі сакрэтнай дыпламатычнай перапіскі, апублікаваныя WikiLeaks, таксама паказваюць, што японскі ўрад хаваў звесткі пра няштатныя сітуацыі на сваіх атамных аб'ектах.

Як піша The Daily Telegraph са спасылкай на скандальны сайт, яшчэ ў снежні 2008 года прадстаўнік Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі папярэджваў, што меры бяспекі на японскіх АЭС не адпавядаюць сучасным стандартам. Паводле яго звестак, за апошнія 35 гадоў сістэма кіравання бяспекай пераглядалася толькі тройчы.

Японскія ўлады ў адказ паабяцалі павялічыць узровень бяспекі на станцыях, у тым ліку на комплексе ў Фукусіме пабудавалі надзвычайны цэнтр супрацьдзеяння на выпадак стыхіі. Аднак, як аказалася, ён разлічаны на землятрусы максімальнай сілай у 7 магнітуд, тады як падземны штуршок 11 сакавіка, які пашкодзіў станцыю, быў з магнітудай 9.

НА ШЛЯХУ ЛЕГІЯНЕРАЎ SS У РЫЗЕ ВЫСТАВІЛІ СВІНЬІЯ ГАЛОВЫ

У Рызе антыфашысты правялі акцыі пратэсту супраць шэсця ветэранаў латышскага легіёна SS, паведамляе DELFI. Праціўнікі легіянераў сабраліся каля помніка Волі, дзе традыцыйна заканчваецца шэсце.

Усяго каля манумента сабралася каля ста антыфашыстаў. Яны трымалі плакаты з надпісамі «Легіянеры — ганебная пляма Латвіі» і «За вамі — кроў і смерць». Некаторыя былі апрануты ў робы, якія імітуюць адзенне вязняў канцлагераў. Некалькі ўдзельнікаў акцыі паднялі на тычках адсечаныя свіныя галовы з надпісамі «Чым ганарыцеся, спадары?».

Калі калона легіянераў і іх прыхільнікаў падышла да помніка, антыфашысты сустрэлі яе крыкамі «Ганьба!» і «Фашысты!». Паведамленняў пра якія-небудзь сутыкненні паміж прадстаўнікамі гэтых груп не паступала. Да помніка Волі была загадзя сцягнута вялікая колькасць паліцыі. Калону легіянераў таксама атачала паліцэйскае ачапленне. Удзельнікі шэсця, спяваючы песні, падышлі да помніка і ўсклалі кветкі. Усяго ў дэманстрацыі, па звестках Mixnews, удзельнічала каля тысячы чалавек. У сваю чаргу, DELFI, спасылаючыся на звесткі паліцыі, паведамляе, што ўдзельнікаў было больш — 2,5-3 тысячы. Дзень легіянераў у Латвіі адзначаецца ў гадавіну адной з падзей Вялікай Айчыннай вайны. Тады, 16 сакавіка 1944 года, латышскі легіён SS упершыню ўступіў у бой з Чырвонай Арміяй.

ТАЛОН У ЗРУЧНЫ ЧАС

У сталіцы заказаць талон да ўрача па інтэрнэце ў зручны для сябе час можна будзе да канца гэтага года, расказала галоўны пазаштатны амбулаторны тэрапеўт камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Наталля Мысліўчык.

Пакуль такая прывілея ёсць толькі ў пацыентаў 34-й цэнтральнай раённай паліклінікі, якая нядаўна абнавіла свой сайт. Астатнія ахвотнікі трапіць да доктара абмежаваныя колькасцю талонаў, забраніраваць якія можна на сайце Мінгарвыканкама (www.minsk.gov.by) у раздзеле «Ахова здароўя».

Праблема ў тым, што часцей за ўсё ў інтэрнэт выкладваецца броня на час, які не падыходзіць грамадзянам, якія працуюць.

— Такія скаргі да нас паступаюць пастаянна, — удакладніла Наталля Мысліўчык. Але на працягу года ўласная старонка ў сусветным павуцінні з умоўнай рубрыкай «Заказаць талон да ўрача» з'явіцца ў кожнай паліклініцы для дарослых. У сеціве будуць выкладвацца талоны на любы прыёмны час участковага тэрапеўта, за рэдкім выключэннем. Разам з карыстальнікамі доступ да аператыўнай інфармацыі аб раздачы броні ў інтэрнэце будзе мець медрэгістратар. Таму накладак не прадбачыцца. Напрыклад, калі талон на 17 сакавіка на 19.00 закажуць па тэлефоне або пры вусным звароце ў рэгістратуру, медык гэты час адразу ж выдаліць з сеціва.

Дададзім, што скарыстацца формай заказу талонаў праз інтэрнэт змогуць пацыенты, чые звесткі ёсць у электроннай базе паліклінікі, гэта значыць, прапісаныя на тэрыторыі абслугоўвання медустановы або часова прымацаваныя да яе.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск—Навіны».*

Былы дырэктар даў указанне...

Супрацоўнікі Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, якія змагаюцца з эканамічнай злачыннасцю, раскрылі аферу ў будаўнічай сферы.

Устанавілі, што былы дырэктар арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць ў сферы будаўніцтва, злоўжываючы сваімі службовымі паўнамоцтвамі, напрыканцы 2009 года даў указанне падрадчыку (кіраўніцтву прадпрымальніцкай структуры) і інжынеру аддзела арганізацыі на складанне і падпісанне актаў выкананых работ з завышанымі аб'ёмамі. У выніку на рахунак прадпрымальніцкай структуры неабгрунтавана было пераліча больш за 1 мільярд 12 мільёнаў бюджэтных рублёў. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

Дзейнічае маньяк?

У Віцебску праваахоўныя органы шукаюць мужчыну, якога падазраюць ва ўчыненні злачынства сэксуальнага характару ў дачыненні да маленькай дзяўчынкі. Пайшлі чуткі, што яго ахвярай была не яна адна. Гэта правяраецца.

Як адзначыў **пракурор Першамайскага раёна горада Віцебска Юрый РАМАНОЎСКІ**, робіцца ўсё магчымае, каб затрымаць зламысніка. Па апісаннях пацярпелай і жыхароў мікрараёна склалі два фотаробаты мужчыны, якому на выгляд каля 55 гадоў. Апісаны і ягоныя прыкметы. Чуткі пра тое, што мужчына кагосьці забіў, не пацвярджаюцца.

Каб не дапусціць новых выпадкаў нападаў, у школах работнікі праваахоўных органаў праводзяць прафілактычныя сустрэчы. Вядома, што мужчына ў ліфце, а потым на лесвічнай пляцоўцы рабіў распусныя дзеянні сэксуальнага характару ў дачыненні дзяўчынкі ва ўзросце 9 гадоў. Было гэта ў адным са спальных мікрараёнаў «Поўдзень». Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Згарэў аўтобус

Гэта здарылася падчас руху пасажырскага аўтобуса «ПАЗ» у Шчучынскім раёне, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.

Узгаранне адбылося ў маторным адсеку. Кіроўца, заўважыўшы дым, скарыстаўся вогнетушыцелем і лакалізаваў узгаранне. Аднак калі паўторна адчыніў адсек, агонь ахапіў аўтобус, прывёўшы яго ў непрыдатны для далейшага выкарыстання стан. На шчасце, кіроўца і два пасажыры, якія знаходзіліся ў салоне, не пацярпелі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

На чыгунцы затрыманы сутэнёр з «таварам»

19-гадовы юнак спрабаваў вывезці ў Маскву 5 сталічных прастытутак

Сваім падапечным дзялок абяцаў у Расіі большыя заробкі і пастаянных кліентаў: «матылькі» пагадзіліся на заманлівую прапанову. Аднак у справу ўмяшаліся супрацоўнікі транспартнай міліцыі і прадстаўнікі іншых праваахоўных органаў, якія сапсавалі «бізнэсмену» ўсе планы.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар УУС на транспарце Аляксандр Марчанка, з дзяўчатамі, узрост якіх складаў ад 16 да 24 гадоў, малады чалавек пазнаёміўся на 9-м кіламетры аўтадарогі Мінск — Віцебск, дзе тыя гандлявалі сваім целам. І прапанаваў ім «дах» — браўся абараніць як ад бандытаў, так і ад праблем з міліцыяй. За гэта путаны павінны былі плаціць свайму абаронцу ад 30 да 50 працэнтаў свайго заробку, які, паводле іх слоў, складае ад 100 да 500 долараў за ноч. Аднак юнаку падаліся малымі заробкі, якія кампанія атрымлівала на радзіме, а таму яны і вырашылі падацца за «шчасцем» у суседнюю краіну. Між іншым, у некаторых з затрыманых жанчын ёсць сем'і і малыя дзеці.

Ігар ГРЫШЫН.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

«УПАКАВАНАЕ» ЖЫЛЛЁ

ў цэнтры сталіцы прадаюць за мільён USD, а аднапакаёўку з праблемамі — усяго за 30 тысяч долараў

ДНЯМІ асобныя інфармацыйныя агенцтвы распаўсюдзілі звесткі аб тым, што ў Мінску пачалі актыўна скупляць супердарагія кватэры коштам да мільёна долараў ці нават даражэй... Няўжо ў сталіцы ёсць такая элітная нерухомасць? Па кваліфікаваны каментар мы звярнуліся да старшыні савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», кіраўніка агенцтва «БелЦТН» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА.

У Мінску ёсць жыллё і коштам больш за 2 млн USD

Адразу нагадаю, што перад тым, як звярнуцца да нашага прафесійнага эксперта, я прагледзеў інфармацыйны рэсурс Нацыянальнага кадастравага агенцтва, якое рэгіструе здзелкі куплі-продажу аб'ектаў нерухомасці.

Самымі дарагімі аб'ектамі жыллёвай нерухомасці, якія былі прададзены фізічным асобам, сёлета сталі вялікія па плошчы шматпакаёвыя кватэры, кошт якіх дасягаў больш як 600 млн рублёў. Пятае месца ў рэйтынгу НКА займае кватэра па вуліцы Шэлеша, 21 з агульнай плошчай 116 квадратных метраў, якую зарэгістравалі, як прададзеную за 604 мільёны рублёў. За 632 мільёны была прададзена кватэра па вул. Смаленскай, 25 агульнай плошчай 178 «квадратаў». Потым ідзе кватэра плошчай 106 квадратных метраў па Старавіленскім тракце, 10 — за 663 мільёны рублёў. Другое месца самага дарагога жылля займае невялікая кватэра па вул. Пуліхава, 29, агульная плошча якой складае ўсяго 98 квадратных метраў — 739 млн рублёў. Самая дарагая кватэра за два першыя месяцы года зарэгістравана кадастравым агенцтвам 21 лютага. Кватэра плошчай 155 квадратных метраў па Лагойскім тракце, 10 была прададзена за 815 млн рублёў, або прыкладна за 270 тысяч долараў.

Вядома, што гэтыя 270 тысяч «зялёных» для сяроднестатыстычнага беларуса з'яўляюцца завоблачнымі грашамі, аднак дзе кватэры за мільён? Мікалай Прасталупаў адзначыў, што на другасным рынку жыллёвай нерухомасці Мінска сапраўды існуюць часам вельмі дарагія кватэры, коштам мільён ці нават два. Робіцца гэта вельмі проста. Купляюцца дзве або тры-чатыры кватэры на адным паверсе ў цэнтры Мінска. Потым робіцца перапланіроўка, і кватэры аб'ядноўваюцца ў адзін аб'ект агульнай плошчай 150—230 квадратных метраў. Робіцца дызайнерскі праект, дзе кухня ўжо 25 квадратных метраў, некалькі ванных пакояў і г.д. У такіх кватэрах сучасная, лепшая ў свеце мэбля і бытавая электроніка. Не, сёлета спадар Прасталупаў кватэры за мільён долараў не дапамагаў прадаваць, аднак дакладна ведае, што такое жыллё на рынку ёсць. Існуе на такія кватэры і кропкавы попыт. Пасля продажу такіх кватэр і рэгіструюцца яны потым па іншым кошце, або ўвогуле кошт аб'екта ў рэгістры адсутнічае.

Зразумела, што кватэры коштам а-ля мільён нейкаму звычайнаму пакупніку з вуліцы ніхто прапаноўваць не будзе. Тут сярод уладальнікаў падобнага дарагога жылля існуе свая сістэма рэкламнай прапановы і канчатковага разліку.

У свабодным продажы кватэры да 500 тысяч USD

Згодна з інфармацыйным каталогам выдання «Нерухомасць Беларусі», самай дарагой прапановай другаснага жылля з'яўляецца трохпакаёвая кватэра па праспекце Незалежнасці, 12 агульнай плошчай 151 квадратны метр за 435 тысяч долараў. Сярод не вельмі вялікіх кватэр адзначым двухпакаёвую кватэру па вул. Харужай, 34-а плошчай 72 квадратныя метры за 230 тысяч долараў. А вось самая танная двухпакаёўка агульнай плошчай каля 32 квадратных метраў прапануецца па вул. Лермантава, 35 за 43 тысячы долараў.

Самая дарагая аднапакаёвая кватэра на свабодным рынку мае агульную плошчу 41,6 квадратнага метра. Такая кватэра па праспекце Незалежнасці, 14 каштуе 90 тысяч долараў. Па рэкламных праспектах самая танная аднапакаёўка прадаецца па вуліцы К. Лібкнехта, 99. Жылое памяшканне плошчай 32,3 квадратнага метра каштуе 36,5 тысячы долараў.

У рэгістры кадастравага агенцтва мы адшукалі адну кватэру па вул. Бяды (50 кв. м) усяго за 30 млн рублёў... Мікалай Прасталупаў адзначыў, што ў Мінску кватэры столькі не каштуюць. Гэта нейкая шэрая здзелка ці аперацыя з папярэднімі ўзаемаразлікамі па схеме абмену.

Увогуле, самыя танныя аднапакаёвыя кватэры плошчай каля 33 квадратных метраў і коштам 30-32 тысячы долараў абавязкова з'яўляюцца праблемнымі. Гэта жыллё пасля пажару, або там доўгі час жылі асацыяльныя асобы, старыя людзі разам з хатнімі жывёламі і г.д.

Сяргей КУРКАЧ.

МИНСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ
отказывается от проведения аукциона по продаже земельных участков в частную собственность 18 марта 2011 года в отношении следующих земельных участков:

1) Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома площадью 0,1499 га, Минский район, Крупицкий с/с, а/г Крупица, кадастровый номер земельного участка 623683906601000496 (Лот 7).

2) Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома площадью 0,1499 га, Минский район, Крупицкий с/с, а/г Крупица, кадастровый номер земельного участка 623683906601000495 (Лот 8)

в связи с их расположением в охранной зоне газопровода высокого давления.

Минский районный исполнительный комитет *31 марта 2011 г.* повторно проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5
1	Адрес земельного участка	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле
2	Кадастровый номер	623681315101000211	623681315101000212	623681315101000213	623681315101000214	623681315101000218
3	Площадь земельного участка	0,1559 га	0,1505 га	0,1515 га	0,1524 га	0,1521 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 178 283	1 178 283	1 178 283	1 178 283	1 178 283
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	11 000 000	11 000 000	11 000 000	11 000 000	11 000 000
7	Задаток (рублей)	1 100 000	1 100 000	1 100 000	1 100 000	1 100 000

		Лот 6	Лот 7	Лот 8	Лот 9	Лот 10
1	Адрес земельного участка	Горанский с/с, д. Новое Поле	Михановичский с/с, п. Михановичи	Михановичский с/с, п. Михановичи	Новодворский с/с, а/г Гатово, участок № 55	Новодворский с/с, а/г Гатово, участок № 62
2	Кадастровый номер	623681315101000219	623684204601001287	623684204601001307	623684301601000363	623684301601000357
3	Площадь земельного участка	0,1522 га	0,1397 га	0,1179 га	0,1538 га	0,1532 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 178 283	600 670	1 285 510	506 546	506 546
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	11 000 000	35 000 000	22 000 000	25 000 000	24 000 000
7	Задаток (рублей)	1 100 000	3 500 000	2 200 000	2 500 000	2 400 000

		Лот 11	Лот 12	Лот 13	Лот 14	Лот 15
1	Адрес земельного участка	Новодворский с/с, а/г Гатово, участок № 63	Папернянский с/с, д. Лапоровичи	Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 126	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 304	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 36
2	Кадастровый номер	623684301601000365	623685505101000331	623686304601000533	623686600601000535	623687508101001111
3	Площадь земельного участка	0,1511 га	0,2063 га	0,1395 га	0,1702 га	0,1397 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	506 546	1 235 513	900 000	1 618 094	331 886
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	24 000 000	37 000 000	12 000 000	15 000 000	14 000 000
7	Задаток (рублей)	2 400 000	3 700 000	1 200 000	1 500 000	1 400 000

		Лот 16	Лот 17	Лот 18	Лот 19
1	Адрес земельного участка	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 372	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 415	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 446	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 453
2	Кадастровый номер	623687508101000794	623687508101001086	623687508101000985	623687508101000731
3	Площадь земельного участка	0,1391 га	0,1320 га	0,1408 га	0,1488 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	331 886	331 886	331 886	331 886
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	16 000 000	15 000 000	16 000 000	17 000 000
7	Задаток (рублей)	1 600 000	1 500 000	1 600 000	1 700 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 31.03.2011 г. в 9.30. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 25.03.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1-6 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 7–8 перечисляется на расчетный счет № 3600621090116 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 9–11 перечисляется на расчетный счет № 3600621100123 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600230217, код платежа – 04901.

На Лот 12 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лот 13 перечисляется на расчетный счет № 3600621150173 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3600621160189 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На Лоты 15–19 перечисляется на расчетный счет № 3600621170195 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Твае правы

Новае месца — з новым кантрактам

ДАВОЛІ тыповая сітуацыя: супрацоўніку арганізацыі прапануюць перайсці на іншую пасаду. Аднак тут адразу ж узнікае некалькі пытанняў. Ці павінен у такім выпадку заключацца і новы працоўны кантракт? І калі павінен — то на які тэрмін? Зрэшты, адказ тут адназначны. Паколькі гаворка ідзе аб пераводзе на іншую пасаду, то заключэнне новага кантракта становіцца абавязковым. Прычым мінімальны тэрмін такога кантракта павінен складаць год, а максімальны — пяць гадоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Між тым, ці можна падпісаць працоўны кантракт усяго на некалькі месяцаў? У якіх выпадках можна звольніць жанчыну з малым дзіцем? І што рабіць, калі работнік не атрымаў «на рукі» другі экзэмпляр свайго кантракта? Разабрацца з усім гэтым мы паспрабуем з дапамогай намесніка **начальніка аддзела працы і зарплаты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Яўгена Леанідавіча КАЗАКЕВІЧА.**

Правілы зніжэння «мінімальнай планкі»

Мець працоўнае месца на як мага большы час — жаданне многіх. Аднак часта на справе ўсё выглядае па-іншаму: ёсць шмат прыкладаў, калі работніку прапануецца той жа кантракт усяго на некалькі месяцаў. Ці магчымы такі варыянт?

— Трэба падзяляць дзве сітуацыі — перазаключэнне і працягу кантракта, — падкрэслівае Яўген Казакевіч. — Так, кантракт можа працягвацца толькі ў межах максімальнага тэрміну яго дзеяння — 5 гадоў. Пры гэтым кантракт павінен працягвацца як мінімум на год. І працяг менш чым на год магчымы толькі пры адной вельмі істотнай умове — пісьмовай згодзе на тое з боку самога работніка.

Што ж да заключэння кантракта пасля заканчэння максімальнага 5-гадовага тэрміну яго дзеяння, пры ўладкаванні на працу ці пры пераводзе на іншую працу, то тут ніякай альтэрнатывы няма. Новы кантракт у любым выпадку падпісваецца не менш чым на год.

Адзіны шлях — калдагавор

Працяг кантрактаў — тэма па-сапраўднаму вострая. І тут даволі папулярнае пытанне: ці павінен наймальнік «пакінуць» на працы жанчыну, якая адна выхоўвае няпоўнагадовае дзіця?

— Заканадаўства забараняе скасаванне кантрактаў па ініцыятыве наймальніка з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі з дзецьмі да 14 гадоў ці з дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце да 18 гадоў — за выключэннем выпадкаў ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка і выпадкаў, выкліканых вінаватымі дзеяннямі саміх работніц, — распавядае Яўген Казакевіч. — І, да слова, варта адзначыць, што гаворка ідзе аб звальненні гэтых катэгорый менавіта па ініцыятыве наймальніка. Бо скасаванне кантрактаў на іншых падставах тут магчымае. Скажам, дапускаецца звальненне той жа цяжарнай жанчыны па ўласным жаданні, па магчымасці бакоў ці па заканчэнні тэрміну працоўнага дагавора.

Адначасова існуе норма: пры згодзе работніка наймальнік абавязаны працягнуць кантракт з маці, бацькам ці апекуном, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў, прынамсі да моманту заканчэння гэтага водпуску і надалей — да моманту, калі дзіцяці не споўніцца 5 гадоў. Якіх-небудзь іншых гарантый жанчынам з дзецьмі заканадаўства не дае. Але трэба мець на ўвазе, што пэўныя гарантыі па працягу кантрактаў з маці, якія адны выхоўваюць няпоўнагадовых дзяцей, можа вызначаць калектыўны дагавор арганізацыі. Прычым парушаць умовы калдагавора наймальнік не мае права.

Часовую пасаду саступаюць

Зноў жа распаўсюджаная з'ява. Жанчына, якая знаходзіцца ў «дэкрэтным» водпуску, вырашае спыніць яго датэрмінова і вярнуцца на працу. Што чакае ў такой сітуацыі іншага работніка, які быў прыняты на месца «дэкрэтніцы»?

— Жанчына, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў, мае поўнае права спыніць такі водпуск і выйсці на працу, па сутнасці, у любы час, — нагадвае Яўген Казакевіч. — Адпаведна, іншы работнік, што быў прыняты на месца «дэкрэтніцы», павінен быць звольнены — з дня, які папярэднічае вяртанню жанчыны з водпуску па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў.

Умовы — не сакрэт

Ведаць умовы сваёй працы — справа ніколі не лішняя. Але здараецца так: работнік падпісвае кантракт і больш... яго ніколі не бачыць.

— Паводле 18-га артыкула Працоўнага кодэкса, кантракт павінен заключацца ў пісьмовай форме і складацца ў двух экзэмплярах, адзін з якіх захоўваецца ў наймальніка, а другі перадаецца работніку, — падкрэслівае Яўген Казакевіч. — Калі ж так не зроблена, то наймальнік абавязаны выканаць усю неабходную працэдуру на працягу трох дзён пасля прад'яўлення адпаведнага патрабавання работніка ці прафсаюза. Прычым у выпадку ігнаравання падобнага патрабавання работнік мае поўнае права звярнуцца ў суд з іскам да наймальніка, а ў сваю чаргу, суд — прымусіць наймальніка прытрымлівацца заканадаўства. І, да слова, варта заўважыць: пры звароце ў суд работнік вызваляецца ад выплаты пошліны.

Сяргей ГРЫБ.

Кватэрнае пытанне

ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УМОЎ...

Я прапісаны і жыву ў кватэры брата. У выканкаме адмаўляюць мне ў пастаноўцы на чаргу для паляпшэння жыллёвых умоў па той прычыне, што ў нас хапае метраў. Але ў брата свая, асобная сям'я, а ў мяне павінна быць свая, а значыць, і кватэра... Тады ці законная гэта адмова?

Л. Вазняк, *г. Мінск*.

Усё залежыць ад умоў: калі вы ў вызначаным парадку ўселены (і, адпаведна, прапісаны або зарэгістраваны па месцы жыхарства) у кватэру брата (або пражывалі там і раней) не як наймальнік жылога памяшкання па заключаным на пэўны тэрмін дагаворы найму, а на ўмовах сумеснага пражывання, то, безумоўна, з'яўляецеся членам сям'і ўласніка жылога памяшкання, і ў гэтым выпадку адмова ў пастаноўцы на кватэрны ўлік цалкам правамерная.

Як вырашыць жыллёвую праблему?

Член сям'і ўласніка жылога памяшкання, які не стаіць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, можа пры неабходнасці атрымаць у вызначаным парадку ў карыстанне асобнае жылое памяшканне шляхам уступлення ў арганізацыю забудоўшчыкаў (ЖБК, ЖК), якая фарміруецца па ініцыятыве грамадзян або грамадзян і юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, заключэння дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва, набыцця жылога памяшкання на першасным або другасным рынку жылля, будаўніцтва індывідуальнага жылога дома. Пры гэтым у выпадку недахопу ўласных сродкаў можна атрымаць банкаўскі крэдыт на фінансаванне будаўніцтва або набыцця жылля ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца банкамі.

Віктар САВІЦКІ.

«Магічная» лічба агню?

Тры чалавекі выратаваны з трохпакаёвай кватэры на трэцім паверсе трохпавярховага жылога дома пры пажары ў кватэры ў Дуброўна. І яшчэ трох суседзяў з-за моцнага задымлення выратавальнікі эвакуіравалі.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па НС, пажар адбыўся а чацвёртай гадзіне дня ў доме на вуліцы Вакзальная. Усе тры чалавекі, якія знаходзіліся ў кватэры: 54-гадовы гаспадар (будаўнік), ягоная жонка і малодшы брат (беспрацоўныя) — былі ў нецвярозым стане. Няшчасным надзелі маскі, каб не атруціліся чадным газам, як і іх суседзям. Мяркуемая прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні.

Жанчына скрала з расійскай машыны

У вёсцы Бароўка Лепельскага раёна 32-гадовая раней судзімая за крадзеж беспрацоўная скрала з машыны «Івека», якая належыць жыхару расійскага горада Калінінград, 19 тысяч расійскіх рублёў і мабільнік. Агульная страта — 2,5 мільёна беларускіх рублёў. Машына была не зачынена, тым больш што ўсё адбывалася ноччу. У дачыненні да зладзюжкі, жыхаркі пасёлка Заслонава, заведзена крымінальная справа.

І... ванна піва

У Віцебскай вобласці сёлета падатковыя органы ўстанавілі ўжо больш за сто парушэнняў заканадаўства, якое рэгулюе вытворчасць і абарот падакцызнай прадукцыі.

З нелегальнага абароту канфіскавалі каля 350 літраў алкагольнай і нехарчовай прадукцыі на аснове спірту, 108 тысяч штук тытунёвых вырабаў, 475 літраў нафтапрадуктаў і больш за 360 літраў соладавага піва. Агульны кошт канфіскаванага — амаль 23 мільёны рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Браканьеры лютуюць

У сярэдневяковай Англіі браканьера маглі асляпіць, кастрыраваць ці павесіць. Даўно гэта было, але той страх перад пакараннем, відавочна, на генетычным узроўні захаваўся ў сённяшніх жыхароў Брытанскіх астравоў. Прынамсі там праблемы браканьерства няма, а мы ў сваёй краіне працягваем з ім змагацца.

Вось тыдзень таму Ганцавіцкі суд аштрафаваў 35-гадовага жыхара райцэнтра за незаконны адстрэл казулі на 1 785 000 рублёў. Акрамя гэтага, браканьер заплаціў за нанесеныя прыродзе страты 2 100 000 рублёў. Здавалася б, такія выплаты павінны былі б працвярэзіць аматараў незаконнага палявання, але аказалася, што на чужых памылках (праступках) вучыцца не хочуць.

Позна ўвечары 10 сакавіка супрацоўнікі Ганцавіцкай дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету на ўездзе ў в. Малькавічы спынілі «Фальксваген Транспарцёр», у якім знаходзілася пяць мужчын і паляўнічы сабака. Пасажыры былі ўзброеныя незарэгістраванымі стрэльбамі і везлі 110 кг мяса лася. Дазволу на адстрэл звяра ў іх не было. Адзін з затрыманых аказаўся былым супрацоўнікам РАУС — сёння пенсіянер.

— Гэтая група нам добра вядомая і мы за імі сачылі даўно, але не маглі схапіць за руку. Ёсць падазрэнне, што застрэлена была ласіха з двума эмбрыёнамі, і калі гэта пацвердзіць экспертыза, то браканьераў чакае цяжкае пакаранне. І хоць адзін з затрыманых усю віну ўзяў на сябе — ён застрэліў звяра, мы будзем настойваць на віне ўсёй групы, — заявіў начальнік дзяржінспекцыі Міхаіл Пішч.

Следства расставіць усе акцэнты, а суд вынесе прыгавор. Браканьеры могуць атрымаць да 6 гадоў абмежавання волі. Давядзецца выплаціць і вялікі штраф ды кампенсаваць нанесеныя прыродзе страты.

Але ж застрэленую ласіху не вернеш.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Факт

НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ АДПАЧЫВАЕ І ПАПРАЎЛЯЕ ЗДАРОЎЕ ЎСЁ БОЛЬШ ГАСЦЕЙ З ЗАМЕЖЖА

Летась у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях Гродзеншчыны адпачылі і паправілі сваё здароўе 15 тысяч іншаземных грамадзян (пятая частка ад агульнай колькасці), што на 37,5 працэнта больш у параўнанні з 2009 годам, паведамляе галоўнае статыстычнае ўпраўленне вобласці.

У мінулым годзе на тэрыторыі Прынямоння працавалі 29 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, у тым ліку 9 санаторыяў. Медыцынскую дапамогу там аказвалі 81 урач і 324 работнікі сярэдняга медыцынскага персаналу. У перыяд максімальнага попыту выкарыстоўвалася 3776 месцаў, што на 1,9 працэнта больш, чым пазалетась. Увогуле паслугамі гэтых арганізацый скарысталіся 74,5 тысячы чалавек (на 5 працэнтаў больш у параўнанні з 2009-м), у тым ліку 16 тысяч дзяцей. 5,9 тысячы чалавек (у асноўным гэта дзеці) прыязджалі на адпачынак і лячэнне з рэгіёнаў, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАЙШОЎ ПА ЕЛКУ

Перад самым Новым годам, 31 снежня, жыхар в. Новая Мыш (Баранавіцкі раён) пайшоў у бліжэйшы лес па елку і не вярнуўся.

14 сакавіка труп прапалага ў каналізацыйнай шахце знайшоў участковы інспектар міліцыі, які абследаваў лес побач з вёскай. Мужчына жыў адзін, не працаваў і любіў выпіць. Судмедэкспертыза ўстанавіла, што 45-гадовага жыхара Новай Мышы забілі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Швабский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Расходы по подготовке документ.	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Мостище, участок № 30/1 623287606101000151	0,1907	1 854 356	9 535 000	953 500
2	д. Мостище, участок № 31/2 623287606101000150	0,2047	1 854 356	10 235 000	1 023 500
3	д. Мостище, участок № 32/3 623287606101000149	0,1969	1 854 356	9 845 000	984 500
4	д. Мостище, участок № 34/7 623287606101000146	0,2338	1 854 356	11 690 000	1 116 900

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, г. Логойск. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 14 апреля 2011 г. в 14.00 по адресу: д. Швабы, ул. Парковая, д. 26 Логойского района Минской обл. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8 апреля 2011 г.

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, (+375 29) 107 16 17.

Наш сайт в Интернете logoysk.gov.by.

УНП 700099501.

ИНФОРМАЦИЯ

о результатах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «Техноприбор» за 2010 год

№ строки	Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный 2010 год
1	Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	млн руб.	45585
2	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	млн руб.	42797
3	Прибыль (убыток) за отчетный период, всего	млн руб.	2091
3.1	в том числе: прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	млн руб.	2788
3.2	прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	млн руб.	-181
3.3	прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	млн руб.	-516
4	Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	млн руб.	1044
5	Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	-
6	Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	-
7	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	млн руб.	1047
8	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	-
9	Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде	руб.	-
10	Количество акционеров, всего	лиц	1789
10.1	в том числе: юридических лиц	лиц	1
10.2	физических лиц	лиц	1788
11	Среднесписочная численность работающих	человек	896
12	Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	0,62

Основным видом продукции, по которому получено более 20 % выручки, является электронасос «Ручеек».

«А я думаю так...»

ЯК УЖЫЦЦА З СУСЕДЗЯМІ?

СКАЖЫ, хто твой сябар, і я скажу, хто ты. Калі раней казалі так, то сёння падыдзе і іншы варыянт: скажы, якія ў цябе суседзі, і я скажу, як табе жывецца. Суседзяў не выбіраюць, але ад таго, ці пашанцуе вам з імі, залежыць ваш спакой у доме. Наколькі беларусы міралюбівыя па характары і праз што ў іх узнікаюць канфлікты са сваімі суседзямі? Уласным досведам са «Звяздой» падзяліліся тэлевядучая, студэнтка журфака, уладальнік аграсядзібы, алімпійская чэмпіёнка і дызайнер адзення.

ЯК ВЫ ЎЖЫВАЕЦЕСЯ З СУСЕДЗЯМІ?

Юрый ЛІХАДЗЕЕЎ, уладальнік аграсядзібы, г. Браслаў:

— Выдатна! Канфліктаў паміж намі не ўзнікае. Часта ходзім адзін да аднаго ў госці, выручаем адзін аднаго ў патрэбе. Хоць у нас і суседзяў асобныя дамы, адлегласць — метраў 10-15, але сябруем. Увогуле, з усімі трэба жыць добра, а з суседзямі — у першую чаргу. Калі суседзі да цябе добра, то і ты да іх. Хоць людзі, вядома, розныя бываюць.

Кацярына СІНЮК, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ:

— Я перасялілася на кватэру з інтэрната. Але ў маёй кватэры вельмі тонкія сцены — рабілі паглыбленне для паліцы і знеслі частку сцяны. У самім жа доме жыве вельмі шмат моладзі. Таму гучная музыка была пастаянна. Прычым калі гудзелі на першым паверсе, было чутно і на пятым. У выніку пасля шматлікіх папярэджанняў мы прыгразілі міліцыяй. З тых часоў усё ціха. Канфлікт вырашылі мірна. А ў інтэрнаце я жыла з кітаянкамі. Запомніўся іх смажаны селядзец і асабліва пах гэтага селядца. Канфлікт мы вырашылі, але для сябе я зразумела: калі хочаш жыць разам, навучыся быць цярпімым. Было б добра, каб такі ж прынцып засвоілі для сябе і прадстаўнікі іншых культур.

Аксана ВЕЧАР, тэлевядучая («ПРОдвижение+», тэлеканал «ЛАД»):

— Калі мы толькі засяліліся, усё было вельмі аптымістычна — мы нават маглі разам сабрацца ўвечары за адным сталом. Гэта пакуль у суседзяў не было дзіцяці. Цяпер у іх нарадзілася дачка, таму стасункі сталі менш шчыльнымі. Можам часам зайсці, папрасіць той жа малаток *(смяецца)*. А вось калі мы жылі ў інтэрнаце, там з суседзямі было цяжэй. У нас быў сабачка, а ў іх — маленькае дзіця. А паколькі ў блоку быў толькі адзін умывальнік, то на гэтай глебе часта ўзнікалі канфлікты.

Саша ВАРЛАМАЎ, дызайнер:

— Нармальна. Увогуле, стараюся нікога не трывожыць, я не лезу ў жыццё суседзяў і не хацеў бы, каб яны лезлі ў маё. Камуністычнае суседства мяне не прываблівае: я не хаджу да суседзяў па соль, хлеб ці мінеральную ваду. Мы вітаемся, па чарзе мяняем лямпачкі ў тамбуры. Але не больш за тое. Мы не робім адзін аднаму гадасцяў — гэта галоўнае, а па імені я ведаю толькі адну суседку, кватэра якой самая блізкая да маёй.

Яніна КАРОЛЬЧЫК, алімпійская чэмпіёнка ў штурханні ядра:

— Добра. Суседзяў па пляцоўцы і ўвогуле віншуем са святамі, Новым годам. Ведаю сем'і і з пятага паверха, і з другога. Толькі часу звычайна бракуе, таму прыйсці ў адведкі не атрымліваецца. Ды і працуе кожны. Але сценкі тонкія, таму часам суседка за сценкай пытае, ці не занадта гучна працуе ў іх тэлевізар, каб нам не перашкаджаць. Ці наша дачка ездзіць на машынцы, пасля суседзі пытаюць, на чым жа яна такім ездзіць, што і ім чуваць *(смяецца.)*

Вядучы рубрыкі Ілья ЛАПАТО.

Абзац

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя шукае кіроўцу, які знік з месца ДТЗ. 15 сакавіка каля 11.30 іншамарка наехала на дзяўчыну-пешахода на праезнай частцы насупраць будынка, што будуецца па вуліцы Гедройца. Кіроўца, які здзейсніў наезд, знік. Дзяржаўтаінспекцыя Мінска просіць відавочцаў здарэння пазваніць у міліцыю.

Лясгасы Беларусі адгрузяць у Расію не менш за 17 млн штук аднагадовых і двухгадовых сеянцаў сасны. На такі аб'ём заключылі дамовы з лясгасамі прадпрыемствы Бранскай і Маскоўскай абласцей.

Поўны абзац

У Расіі забаранілі гарэлку «Валодзя і мядзведзі». Федэральная служба па інтэлектуальнай уласнасці, патэнтах і таварных знаках (Распатэнт) адмовілася рэгістраваць таварны знак гарэлкі «Валодзя і мядзведзі» на той падставе, што гэта можа нанесці ўрон іміджу і інтарэсам Расіі. Эксперты ўбачылі ў назве гарэлкі намёк на Уладзіміра Пуціна і Дзмітрыя Мядзведзева, пра што ўказана ў заключэнні: «Існуе магчымасць успрыняцця гэтага словазлучэння расійскім спажыўцом як абыгрыванне імені і прозвішча першых асобаў дзяржавы». Гарэлка «Валодзя і мядзведзі» выпускаецца кампаніяй «Вінэксім» на ўкраінскім заводзе Prime. Раней кампанія атрымала вялікую вядомасць дзякуючы іншаму свайму прадукту — гарэлцы «Пуцінка».

Самым дарагім сабакам у свеце прызнана аднагадовае шчаня тыбецкага мастыфа, прададзенае на аўкцыёне ў Кітаі за 10 млн юаняў ($1,5 млн). Пакупніком шчанюка чырвонай масці па мянушцы «Вялікі ўсплеск» стаў вугальны барон-мільянер. Пакупнік расказаў прадаўцу, што набыў жывёлку не толькі з-за любові да сабак, але і як выгадную інвестыцыю: арэнда сабакі з выдатнай радаслоўнай прыносіць гаспадару каля 100 тыс. юаняў ($15,2 тыс.) за вязку — сабака акупляецца за пару гадоў. Дарагі сабака патрабуе і адпаведнага ўтрымання — даглядаць яго будзе цэлы штат слуг. У рацыён шчаняці ўваходзяць ялавічына і мяса птушкі, а таксама малюскі і іншыя морапрадукты.



Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Нанёс шкоду здароўю — аплачвай лячэнне!

Сёння дзяржава затрачвае немалыя грошы на лячэнне людзей, у тым ліку і тых, якія трапілі на бальнічны ложак па віне іншых асоб. За апошніх Генеральная пракуратура вырашыла ўзяцца па поўнай праграме. Аб гэтым сведчыць хоць бы тое, што толькі за два месяцы ў дачыненні вінаватых заяўлена 1016 іскаў аб спагнанні грашовых сродкаў, затрачаных на лячэнне пацярпелых, на суму больш за 738 мільёнаў рублёў. Такія іскі, як правіла, судом задавальняюцца, і ў дзяржаўную казну вяртаюцца грошы. Работа ў гэтым кірунку, пераканаў карэспандэнта «Звязды» начальнік аддзела па наглядзе за дазнаннем Генеральнай пракуратуры Салаўдзі МАГАМАДАЎ, будзе працягвацца і надалей.

А пачалося ўсё з чаго? Напрыканцы мінулага года аддзел па наглядзе за дазнаннем ездзіў па рэспубліцы з планавымі праверкамі. Падчас рэйдаў звярнулі ўвагу, што далёка не ва ўсіх рэгіёнах пракуроры актыўна прад'яўляюць іскі ў інтарэсах органаў аховы здароўя па кампенсацыі злачынцамі дзяржаўных сродкаў, выдаткаваных на лячэнне пацярпелых. Неадкладна было дадзена ўказанне актывізаваць гэту работу.

— У выніку літаральна за 2 месяцы было заяўлена 1016 іскаў абласцей і горада Мінска на суму больш за 738 мільёнаў рублёў, — паведаміў Салаўдзі Магамадаў. — З іх за лячэнне ва ўстановах аховы здароўя — на суму 665 мільёнаў 689 тысяч рублёў, выплаты дапамог па часовай непрацаздольнасці — на 72 мільёны 717 тысяч рублёў. У стадыі падрыхтоўкі зараз знаходзіцца яшчэ 925 такіх іскаў на суму звыш 600 мільёнаў беларускіх рублёў.

Салаўдзі Рашыдавіч адзначыў, што па змесце іскі аб спагнанні грашовых сродкаў, затрачаных на лячэнне, даволі тыповыя. Адрозніваюцца бадай што толькі коштам. Для нагляднасці ж прывёў тыповую сітуацыю.

Падчас распіцця спіртнога паміж спадаром Б. і яго знаёмым С. разгарэўся канфлікт. Як кажуць, нешта не падзялілі на п'яную галаву. Падчас сваркі Б. адзін раз ударыў рукой па твары С. Па выніках праверкі, якую правяло ўпраўленне ўнутраных спраў адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска, крымінальная справа не была заведзена, бо злачынствы такой катэгорыі адносяцца да спраў прыватнага абвінавачвання і распачынаюцца выключна па жаданні пацярпелага.

Спадар С. з атрыманай траўмай — у адпаведнасці з заключэннем судова-медыцынскай экспертызы, яму нанесены цялесныя пашкоджанні ў выглядзе адкрытага траўматычнага пералому ніжняй сківіцы, якія адносяцца да катэгорыі лёгкіх пашкоджанняў — на працягу 10 дзён знаходзіўся на лячэнні ў 11-й гарадской клінічнай бальніцы. У адпаведнасці з артыкулам 64 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» фізічныя асобы, якія нанеслі ўрон здароўю грамадзян, павінны кампенсаваць арганізацыям аховы здароўя выдаткі на дыягностыку, лячэнне, рэабілітацыю, пратэзаванне гэтых асоб у выпадку атрымання грамадзянінам калецтва ці іншага пашкоджання здароўя ад супрацьпраўных дзеянняў. Тое ж самае абавязвае зрабіць вінаўніка і 933 артыкул Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Гэта гісторыя скончылася тым, што пракурор Маскоўскага раёна Мінска прад'явіў іск з просьбай спагнаць са спадара Б. на карысць 11-й гарадской клінічнай бальніцы грошы, затрачаныя на лячэнне С. у суме 784 560 рублёў.

— Гэта максімальная сума кампенсацыі? — пацікавілася я ў суразмоўцы.

— Сумы тут могуць быць розныя: і менш як сто тысяч, і больш як мільён. Самыя буйныя іскі прад'яўляюцца, як правіла, у дачыненні да віноўнікаў дарожна-транспартных здарэнняў, яны даходзяць і да 3 мільёнаў. Выдаткі ўстановы аховы здароўя, самі разумееце, залежаць ад цяжкасці атрыманых траўмаў пацыента, ад таго, наколькі доўга па часе цягнецца лячэнне. Напрыклад, адзін дзень у рэанімацыі абыходзіцца ў 300 тысяч беларускіх рублёў.

На погляд Генпракуратуры, гэта каральная мера не толькі дапаможа спагнаць з віноўнікаў грошы на карысць дзяржавы, але і стане сур'ёзнай мерай прафілактыкі падобных правапарушэнняў.

— Чалавек павінен ведаць, што калі ён нанёс шкоду здароўю іншага, то будзе абавязаны аплачваць яго лячэнне з уласнай кішэні, — падкрэсліў Салаўдзі Магамадаў. — Мы спадзяёмся, што наша ініцыятыва будзе стрымальным фактарам для патэнцыйных правапарушальнікаў.

Салаўдзі Магамадаў цвёрда перакананы, што прымаць неабходныя меры, каб грошы вярнуліся ў дзяржаўную казну, павінны не толькі праваахоўныя органы, але і ведамствы, якія непасрэдна нясуць выдаткі. Маўляў, наша дзяржава не настолькі багатая, каб направа і налева раскідвацца мільярдамі народных рублёў. Пакуль жа іскі, пра якія ідзе гаворка, прад'яўляюцца пераважна пракурорамі, у адзінкавых выпадках непасрэдна ўстановамі аховы здароўя.

— Мы б хацелі, каб ініцыятыва па пытаннях кампенсацыі затрат на лячэнне такіх хворых усё ж такі выходзіла ад органаў аховы здароўя. Гэта, па вялікім рахунку, іх непасрэдны абавязак. Мы, у сваю чаргу, гатовы прапанаваць схему іх узаемадзеяння з органамі ўнутраных спраў.

Падчас гутаркі начальнік аддзела па наглядзе за дазнаннем паведаміў, што з кожным годам павышаецца і працэнт кампенсацыі нанесенага ўрону па злачынствах маёмаснага характару (рабаванні, крадзяжы, разбоі, махлярства і інш.) на стадыі папярэдняга расследавання крымінальнай справы. Калі ў 2009 годзе органамі следства і дазнання кампенсавана ўрону па крымінальных справах на суму 35 мільярдаў рублёў, то за мінулы год — на суму звыш 42 мільярдаў рублёў.

— Салаўдзі Рашыдавіч, паколькі мы ўжо размаўляем пра грашовую кампенсацыю, то цікава б было даведацца, што вы асабіста думаеце наконт эканамічнай амністыі, якая ўвайшла ў Канцэпцыю ўдасканалення сістэмы мер крымінальнай адказнасці?

— Эканамічная амністыя ўжо не першы год прымяняецца ў шэрагу развітых еўрапейскіх краін. І перш чым прыйсці да неабходнасці яе прымянення ў Беларусі, былі ўзважаны ўсе «за» і «супраць». На мой погляд, кірунак абраны правільны. Я згодны, што за шэраг правапарушэнняў, падкрэслю, якія не прадстаўляюць грамадскай небяспекі, чалавек павінен адказваць не воляй, а «кішэняй». Гэта вельмі разумная палітыка дзяржавы. Казаць жа пра эфектыўнасць гэтай меры пакарання можна будзе рабіць пазней, пасля аналізу прамежкавых вынікаў.

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.

Ліга чэмпіёнаў

«Інтэр» не даў «Баварыі» шанцаў на рэванш

Вызначыліся яшчэ два чвэрцьфіналісты Лігі чэмпіёнаў — італьянскі «Інтэр» і англійскі «МЮ».

Супрацьстаянне «Інтэра» і «Баварыі» стала паўторам фіналу леташняга розыгрышу Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў, і той пройгрыш быў для мюнхенцаў выдатным раздражняльнікам. Улічваючы, што першы паядынак, які быў хатнім для «Інтэра», «нерадзуры» прайгралі (0:1), рэванш «Баварыі» выглядаў справай цалкам верагоднай. Нямецкі клуб паказаў выдатную камандную гульню ў нападзенні, і, нягледзячы на хуткі гол Самюэля Это'о, у першым тайме «Баварыя» выйшла наперад, забіўшы два мячы. Але ў другім тайме «Інтэр» пачаў атакаваць больш актыўна, што скончылася галамі Снайдэра і Пандэва. 3:3 па суме двух матчаў, і далей ідзе «Інтэр».

«Манчэстэр Юнайтэд» выйшаў у чвэрцьфінал Лігі чэмпіёнаў, адолеўшы «Алімпік» 2:1. Для перамогі англічанам хапіла намаганняў Хаўера Эрнандэса, які ў кожным тайме забіў па голу. Напрыканцы матчу, калі падчас розыгрышу вуглавога Браўн накіраваў мяч ва ўласныя вароты, надзеі марсэльцаў на выратаванне адрадзіліся, аднак англічане не далі ім шанцаў спраўдзіцца.

Алена КРАВЕЦ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.03.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	3 020,00	1 чэшская крона	172,82	USD	28,6582
▲1 еўра	4 218,34	1 польскі злоты	1041,31	10 UAH	36,0141
1 латвійскі лат	5 968,38	▲1 расійскі рубель	105,38	1000 BYR	9,4801
1 літоўскі літ	1 221,09	1 украінская грыўня	379,61	EUR	40,0728

БЫВАЙ, ЗБРОЯ

На Брэстчыне прайшло мерапрыемства «Арсенал», падчас якога выяўляліся незаконныя дзеянні, звязаныя з агнястрэльнай зброяй, боепрыпасамі і выбуховымі рэчывамі.

Па звестках Аддзела інфармацыі УУС аблвыканкама, за розныя парушэнні канфіскаваны 73 адзінкі зарэгістраванай зброі, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнутыя 55 чалавек, а ў 43 —ануляваны дазвол на захоўванне зброі.

Таксама было добраахвотна здадзена 42 адзінкі незарэгістраванай зброі (з іх 11 з наразным ствалом), 27 790 патронаў. А яшчэ 70 ствалоў зарэгістраванай зброі грамадзяне і арганізацыі здалі па сваёй волі.

У Баранавічах чалавек аддаў аўтамат «ППШ», а ў Івацэвічах — вінтоўку «Мосіна». У Пружанах жа грамадзянін здаў пісталет «ТТ» і 22 патроны да яго. Апошні растлумачыў, што знайшоў пісталет пры разборцы нежылой хаты ў вёсцы.

Той, хто здаў зброю і боепрыпасы добраахвотна, вызваляецца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НОВЫЯ ЛІСТЫ ПРА ГАЛОЎНАЕ

З людзьмі і сам-насам

...Не вам казаць: водгукі на публікацыі бываюць рознымі. У тым ліку і досыць нечаканымі. Прынамсі, па форме: «Я вельмі даўні, адданы падпісчык «Звязды», — піша пасля прывітанняў Уладзімір ЛАБКО з вёскі Дзераўная Слонімскага раёна, — вельмі даўні, адданы чытач. І цяпер дасылаю вам тое, што «нарыпела» ў мяне пад уплывам юбілею майго ўлюбёнага паэта і вашых, звяздоўскіх «...Лістоў пра галоўнае».

Пасля чаго, з абзаца, чытач распавядае:

«Наўкол зіма, а я «Вянок» Максімаў у руках трымаю. Ён па гадах мне як сынок — я з ім як з сынам размаўляю. За сказам сказ, за вершам верш... Ён разважае вельмі стала. Усё разумею! Ды найперш гляджу, каб слоўца не прапала — пра любы край, ды з мовай роднай... Калі ж зажыць ёй тут, свабоднай? Запанаваць у родным краі?... Пытае ён і я пытаю... Так у размовах ноч праводзім, але адказу — не знаходзім, бо як і дзвесце і сто год не знае мовы мой народ. Таму і ў свеце не ў пашане... Калі ж той лепшы час настане?»

Балючыя пытанні. І даймаюць яны вельмі многіх нашых чытачоў.

«З хваляваннем, з задавальненнем сачу за заступніцтвам газеты за гаротніцу-мову, мову-Папялушку, якая вось-вось можа аказацца за парогам роднае хаты-дзяржавы. Хто ж так распараджаецца, хто ж так гаспадарыць у ёй? Як быццам, мы, але ж ці беларусы?» — пытае **Ірына Міхайлаўна РУДКОЎСКАЯ з вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна**. І далей узгадвае, як некалі ў таго ж, горача любімага Максіма Багдановіча спыталі, чаму ён напоўніў свой «Вянок» санетамі, ронда, трыялетамі і іншымі формамі? На што паэт адказаў: «За беларускай мовай не хочуць прызнаць самастойнасці і самабытнасці. Не хочуць дапусціць і думкі, што на гэтай мове можна выразіць усе рухі чалавечай душы і даць любую літаратурную форму. Я сваёй кніжкаю хацеў паказаць, што ўсё гэта магчыма. А для гэтага трэба было беларускую мову паставіць побач з еўрапейскімі мовамі».

«Сказана так, зроблена, — падкрэслівае Ірына Міхайлаўна, — у пачатку мінулага стагоддзя нашым класікам, пасля якога над родным словам шчыравалі такія тытаны, як Колас і Купала, Караткевіч і Быкаў, Шамякін і Танк... Дык чаго ж вартыя мы, сучасныя беларусы, калі аб тое, што ў выніку атрымалася, выціраем ногі самі і дазваляем тое ж іншым? Чаму не ўцямім, што з-за сваёй абыякавасці і блізарукасці нішчым найгалоўнейшы скарб, які папярэднікі пакінулі нам у спадчыну? Чаму не думаем, што, загубіўшы мову, мы знікнем з твару зямлі як нацыя?»

І далей: «Спадар Аляксандр Лукашанец («Звязда» 1 лютага 2011 г.) заявіў, што апошнім часам беларуская мова становіцца ўсё больш прыкметнай у краіне. А я гэтага чамусьці не адчуваю, — скардзіцца чытачка. — Мо таму, што жыву, у глыбінцы на Палессі, як кажуць, у чорта на рагах, і сюды яшчэ проста не дайшлі тыя прыкметы. Бо гляджу вось па тэлебачанні праграму з красамоўнай назвай «Пра мастацтва». Як быццам сама назва ўказвае на яе беларускамоўнасць, але ж не — вядоўца размаўляе па-руску. Што абражае, — па-руску нават з тымі, хто карыстаецца беларускай! Не ведаю, як іншым прыхільнікам мастацтва, а мне гэты моўны вінегрэт, мякка кажучы, непрыемны.

На радыё, у параўнанні з тэлебачаннем, значна больш беларускасці, — працягвае спадарыня Рудкоўская, — там яшчэ ёсць і беларускае слова, і беларуская песня, і цудоўная «Моўная хвілінка»... Але ж не без прыкрасцяў. Журналіст, напрыклад, вядзе перадачу па-беларуску, а, уступаючы ў размову з чыноўнікам (высокім ці і не вельмі), пераходзіць на рускую. Цалкам магчыма, што суразмоўцы, абодва — добрыя спецыялісты, добрыя людзі, але ж паважаць іх... Прабачце. Як на маю думку, дык тут на паверхні, як мінімум, неадукаванасць і нявыхаванасць аднаго і заахвочванне іх з боку другога. Калі не больш, бо ў Законе аб мовах ясна сказана пра абавязак чынавенства ведаць беларускую. Дык чаму ж тады нават тыя, што пішуць законы, іх не выконваюць? Дзе, у якой краіне магчыма, каб чыноўнік, не валодаючы мовай гэтай краіны, больш за тое — адкрыта (!) парушаючы яе закон — займаў пасаду? Які гэта прыклад для радавых грамадзян, асабліва — для моладзі?

Мы, дарэчы, — разважае чытачка, — любім на яе наракаць. Не без падстаў: многія маладыя без мацюкоў не могуць выказаць нават самую элементарную думку. Брыдкасловяць п'яныя і цвярозыя, жанчыны і дзеці. Прычым, неабавязкова ў сварцы — у звычайнай гутарцы, паганяючы каня, пасучы кароў, выхоўваючы дзяцей. Але ж... Карцінка з натуры. Гутару са студэнткай, пытаюся:

— А якой жа мовай вы карыстаецеся ў зносінах паміж сабой — у групе, у інтэрнаце?

— Рускай.

— Чаму?!

— Дык жа і выкладчыкі лекцыі вядуць на беларускай, а між сабою толькі па-руску.

Што тут дзіўнага, скажаце вы? А тое, што студэнты гэтыя — будучыя выкладчыкі беларускай мовы. Вы хацелі б, каб яны вучылі вашых дзяцей? Я — не. Бо такія настаўнікі, ганьбуючы родным словам у побыце, не зацікавяць вучняў сваім прадметам, нічога не дадуць ім.

Обеспеченность акции имуществом общества (тыс. руб.)	19,29
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	-
Просроченная дебиторская задолженность (млн. руб.)	1649
Просроченная кредиторская задолженность (млн. руб.)	661
Среднесписочная численность работающих	607
Основные виды продукции или виды деятельности по которым получено 20 и более % от реализации товаров (работ, услуг)	оптовая торговля алкогольными и табачными изделиями

Данные бухгалтерской отчетности удостоверены аудиторской фирмой «Белросаудит», лицензия № 02200/0495344 от 05.01.2009 г.

УНН 100025653.

САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА: вясковы фармат

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Супрацоўнікі сацыяльных пунктаў праводзяць рэгулярныя абследаванні ўмоў жыцця адзінокіх пенсіянераў, інвалідаў і шматдзетных сем'яў з навакольных вёсак, што дазваляе дакладна вызначыць праблемы гэтых катэгорый грамадзян. Нарэшце, для тых жа пенсіянераў, інвалідаў і сем'яў з дзецьмі пры пунктах створаны разнастайныя гурткі. Практыка сведчыць: гутаркі псіхолагаў аб асаблівасцях жыцця ў старасці, шкодзе алкаголю і цыгарэт, аб змаганні з анкалагічнымі захворваннямі выклікаюць вялікі інтарэс. Гэтаксама, як і кансультацыі юрыстаў па пытаннях пераафармлення жылля.

— Дзякуючы сацыяльным пунктам у многіх знікае патрэба ехаць у Магілёў, прычым ад самага пачатку было вызначана: такія пункты павінны працаваць у найбольш аддаленых ад абласнога цэнтра аграгарадках, — падкрэслівае Таццяна Ражкова. — Да таго ж яшчэ адна цікавая акалічнасць: амаль усе сацыяльныя пункты знаходзяцца ў адміністрацыйных будынках сельскіх Саветаў. І такое суседства зручнае: ёсць магчымасць вырашаць разнастайныя праблемы, не выходзячы з будынка.

Адначасова некаторыя пытанні можна «зняць» і непасрэдна ў сваёй вёсцы. У невялікіх населеных пунктах раёна працуе паўсотні дамоў сацыяльных паслуг. Звычайна яны месцяцца ў хаце аднаго з вяскоўцаў, прычым, гаспадару прапануецца чыста сімвалічнае заахвочванне — недзе 50-100 тысяч рублёў.

— Дамы сацыяльных паслуг па графіках наведваюць розныя службы раёна — медыкі, работнікі культуры, прадстаўнік райвыканкама, спецыяліст па пенсіях, псіхолаг, юрыст. Тут жа ў абавязковым парадку прысутнічаюць участковы міліцыянер і старшыня сельскага Савета, — адзначае Таццяна Ражкова. — Такім чынам, з'яўляецца магчымасць аказаць аператыўную дапамогу: каму з дровамі, каму — з вадой, а каму — з афармленнем у дом-інтэрнат ці з часовым змяшчэннем на сацыяльныя ложкі ў бальніцу. А ў дадатак у нас існуе не менш цікавая практыка. Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання заключыў пагадненне з праваслаўнай царквой. У выніку святары наведваюць тыя ж невялікія вёскі, праводзяць гутаркі з іх жыхарамі, а па жаданні — нават асвячаюць дамы.

* * *

Асобная тэма — інваліды. Нельга не прызнаць, што больш-менш прымальны асяродак для іх жыцця ў гарадах усё ж ёсць. Іншая размова — вёскі. Часта тут людзі з абмежаванымі магчымасцямі вымушаныя бавіць час у межах чатырох сцен.

— Мы паспрабавалі змяніць сітуацыю, адкрылі ў трох аграгарадках раёна аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў, прычым у адным месцы яно знаходзіцца ў пераабсталяванай кватэры, у другім — у амбулаторыі, а ў трэцім — у будынку сельвыканкама, — кажа Таццяна Ражкова. — Без бюджэтных выдаткаў не абышлося. Аднак адметна, што пайшлі насустрач спонсары. Дзякуючы ім набылі частку мэблі, трэнажоры, камп'ютары.

Фактычна гэта невялікі клуб, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць маляваць, плесці, вязаць ці, з улікам стану здароўя, займацца чым-небудзь іншым. А яшчэ яны могуць проста сустрэцца, паразмаўляць паміж сабой. Менавіта гэта акалічнасць і стала галоўнай — на «вясковыя» аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў адразу ж з'явіўся попыт.

Сяргей ГРЫБ.

Магілёўскі раён.

Ад практыкі ці ад «асфальту»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Сёння, напрыклад, я праводжу аб'яднанае пасяджэнне адразу двух фарміраванняў: камісіі па справах няпоўнагадовых і грамадскага пункту аховы парадку. Хоць, калі падыходзіць фармальна, раблю няправільна, бо ад мяне патрабуюць праводзіць гэтыя пасяджэнні асобна. Але мне зручней іх аб'яднаць, я такім чынам зэканомлю час — свой і людзей, якія працуюць у камісіях. Але ж пратаколы ўсё роўна неабходна пісаць асобныя па кожным фарміраванні. Навошта? Можна было б абысціся агульным пратаколам, адной паперай замест дзвюх... І колькасць структур, якія нас правяраюць, скарацілася б. Бо сёння адна інстанцыя правярае нас па сваёй лініі, другая — па сваёй, трэцяя — па сваёй... А так будзе адзіны пратакол, і правярайце яго, калі ласка!

Але ёсць закон аб асновах прафілактыкі, змяніць які мы не правамоцныя. Не ведаю, хто працаваў над гэтым дакументам, але ўражанне такое, што рыхтавалі яго, ідучы не ад практыкі, а ад «асфальту». З кіраўнікамі першаснага звяна ўлады, напэўна, ніхто не раіўся. Або раіліся, ды не прынялі іх меркаванняў да ўвагі.

Напрыклад, сёння на наша чарговае пасяджэнне запрошаны 20 чалавек, якія знаходзяцца на прафілактычным уліку: гэта парушальнікі грамадскага парадку, нядбайныя бацькі, п'яніцы і іншыя суб'екты. Разбірацца і прымаць тое ці іншае рашэнне будзем літаральна па кожным... Доўжыцца пасяджэнне звычайна 1,5—3 гадзіны, а вось напісанне папер займае потым цэлы дзень, а то і больш. Так, гэта наша праца. Але яе можна было б спрасціць і аптымізаваць.

Наталля КАРПЕНКА.

НЯМА ВАДЫ НА СЕЛЬСКАЙ ВУЛІЦЫ

У рэдакцыю паступіў сігнал пра тое, што два месяцы няма вады ў калонках у вёсцы Уна Лёзненскага раёна на вуліцы Палявая. Таму мясцовыя жыхары вымушаны хадзіць па ваду да калодзежа.

Як паведаміў **спецыяліст першай катэгорыі Лёзненскага сельвыканкама Сяргей БАЛОЦІН**, вады насамрэч няма ў трох калонках ужо не першы тыдзень, бо прарвала старую водаправодную трубу. Гэтая камунікацыя належыць мясцовай гаспадарцы «Адаменкі». Як растлумачыў адзін з кіраўнікоў гаспадаркі, іржавая труба будзе заменена на сучасную. Трубу, муфты і іншае ўжо закупілі. Неабходная тэхніка для замены і пракладкі новай трубы будзе выдзелена.

З вырашэннем пытання абяцаюць не зацягваць і пастараюцца даць ваду ў калонкі на працягу двух тыдняў. Каб жыхары вуліцы — а гэта каля дваццаці чалавек — маглі, як і раней, карыстацца калонкамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ ІНСТАНЦЫЯ

Стаўпнянскі сельскі Савет Рагачоўскага раёна, які ўзначальвае Ірына Віннікава, паставіў перад сабой мэту працаваць так, каб пасля звароту ў мясцовы орган улады грамадзяне больш не мелі патрэбы кудысьці звяртацца. Безумоўна, не ўсе пытанні жыхароў пасёлка Беліцк, аграгарадка Стоўпня і іншых населеных пунктаў сельсавета магчыма вырашыць на месцы.

— Тым не менш імкнёмся рабіць усё неабходнае, каб вяскоўцу, які прыйшоў да нас з нейкай просьбай, прапановай, скаргай, дапамагчы, задаволіць яго законнае патрабаванне, — гаворыць Ірына Віннікава.

Сапраўды, за мінулы год калектыўных і паўторных зваротаў, а таксама зваротаў, накіраваных праз вышэйшыя органы, у сельвыканкам не паступала. Тут былі зарэгістраваны 103 вусныя і 22 пісьмовыя звароты.

— У сувязі з арганізацыяй працы па заяўляльным прынцыпе «Адно акно» ў памяшканні сельвыканкама і ва ўсіх населеных пунктах афармлены і своечасова абнаўляюцца інфармацыйныя стэнды, — уключаецца ў размову кіраўнік справамі сельвыканкама Наталля Цвердзіна. — Тут ёсць канкрэтная і даступная для разумення інфармацыя аб відах і аб'ёмах паслуг, якія прадастаўляюцца жыхарам населеных пунктаў сельсавета арганізацыямі розных сфер абслугоўвання.

Падчас звароту ў сельвыканкам людзі павінны атрымліваць поўную інфармацыю, а таму пры неабходнасці работнікі сельвыканкама звязваюцца з адпаведнымі раённымі службамі для атрымання канкрэтнага адказу на пастаўленыя пытанні, аказання дапамогі чалавеку. Гэта выключае выпадкі звароту грамадзян у больш высокія інстанцыі.

Міхась КАВАЛЁЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район:

№ лота	Наименование объекта аренды	Адрес объекта аренды	Арендуемая площадь, м²	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Изолированное помещение (инвентарный номер 600/D-29444, помещение общественного питания (ресторан)	Минский район, р-н д. Боровая, 1-102	413,8	20 000 000	3 000 000
1-й этаж общей площадью 286,1 м², в том числе зал ресторана 150,7 м², подсобное помещение (кухня) – 135,4 м², цокольный этаж (подсобные и технические помещения) – 127,7м²					

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, комната 302.

Торги состоятся **05.04.2011 года**, в **14.00**, по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5%** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом аренды;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Обязательные дополнительные требования к претендентам на участие в аукционных торгах:

Претенденты на участие в торгах перед перечислением задатка обязаны связаться с организатором аукциона и представить материалы, свидетельствующие о том, что претендент соответствует указанным обязательным дополнительным требованиям. Если претендент соответствует этим обязательным дополнительным требованиям, то он получает согласие организатора торгов на перечисление задатка, а также может ознакомиться с объектом аренды.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район»** № 3012000273011 в ф-ле ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 115 г. Минск, ул. Кропоткина, 91, код 749, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона должен не позднее дня, следующего за днем проведения аукциона, после окончания торгов подписать протокол о результатах аукциона. Протокол подписывается в двух экземплярах победителем аукциона и членами аукционной комиссии.

Оплата стоимости приобретенного права заключения договора аренды на объект недвижимости осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

Победитель аукциона заключает договор на аренду нежилого помещения в течение 5 (пяти) банковских дней с момента исполнения обязательств по оплате стоимости лота.

Срок договора аренды нежилого помещения – **5 (пять) лет**. Арендная ставка с НДС за один квадратный метр в месяц без эксплуатационных расходов на арендуемое помещение и без эксплуатационных расходов на помещения общего пользования: **ЛОТ № 1 – 10 (десять) у.е.** за изолированное помещение (инвентарный номер 600/D-29444, помещение общественного питания (ресторан) площадью **413,8 кв.** Одна у.е. равна стоимости одного евро, выраженной по курсу Национального банка Республики Беларусь. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **04.04.2011 г.** до **14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. Тел.: (017) 237 91 32, 237 93 95.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.810. **Нумар падпісаны ў 19.30.**

КАЛІ ПЕНСІЯ — БЕЗ СТАЖУ

Сяргей ГРЫБ

Звычайна памер пенсіі залежыць ад дзвюх акалічнасцяў — стажу і ранейшага заробку. Аднак у гэтым правіле ёсць выключэнні. Бываюць выпадкі, калі па аб'ектыўных ці суб'ектыўных прычынах чалавек не працаваў. І тады ў яго застаецца адзін варыянт — пенсія сацыяльная.

Пункт адліку — БПМ

Сацыяльныя пенсіі залежаць ад бюджэту пражыткавага мінімуму. У сваю ж чаргу, апошні пераглядаецца і, як правіла, павышаецца чатыры разы ў год — з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня, 1 лістапада. І, да слова, цяпер БПМ у сярэднім на душу насельніцтва адпавядае 296.870 рублям.

— Сацыяльныя пенсіі прызначаюцца грамадзянам, якія не могуць атрымліваць пенсію працоўную, — распавядае **начальнік аддзела прызначэння і выплаты пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ала КОЛБІК.** — У прыватнасці, сацыяльныя пенсіі прызначаюцца на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў: пры першай ступені страты здароўя памер такой пенсіі складае 60 працэнтаў, другой ступені страты здароўя — 65 працэнтаў, трэцяй ступені — 75 працэнтаў, чацвёртай ступені — 85 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму. Таксама права на сацыяльную пенсію маюць «дарослыя» інваліды, у якіх няма дастатковай працягласці працоўнага стажу. Пры I групе інваліднасці памер такой пенсіі вызначаецца ў 85 працэнтаў, пры II групе інваліднасці з дзяцінства — у 75 працэнтаў, пры II групе інваліднасці ад агульнага захворвання — у 65 працэнтаў, а пры III групе — у 55 працэнтаў БПМ.

Апроч таго, сацыяльная пенсія прызначаецца жанчынам пасля дасягнення 55 ці мужчынам пасля дасягнення 60 гадоў пры недастатковай працягласці стажу. Памер такой пенсіі адпавядае 50 працэнтам БПМ.

Нарэшце, заканадаўства вызначае магчымасць атрымання сацыяльнай пенсіі па страце карміцеля ў памеры 65 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму.

— Пры гэтым з 1 лістапада мінулага года да сацыяльных пенсій дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў I, II, III груп, дзяцей, якія страцілі карміцеля, вызначана фіксаваная даплата, — зазначае Ала Колбік.— Памер такой даплаты складае 40 тысяч рублёў штомесяц.

Пяць гадоў. І да таго ж «легальнай» працы

Памер працоўных пенсій па ўзросце — вышэйшы. Магчымасць прызначэння такіх пенсій з'яўляецца толькі тады, калі ў чалавека ёсць не менш за 5 гадоў страхавога стажу. Прычым у гэты 5-гадовы тэрмін не ўваходзяць так званыя «крэдытныя перыяды» — час навучання з атрыманнем прафесіі на стацыянары, час службы ў войску, час догляду дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, догляду за інвалідам I групы ці пажылым чалавекам ва ўзросце больш за 80 гадоў.

— Варта заўважыць, што гаворка ідзе менавіта аб страхавым стажы, — падкрэслівае Ала Колбік. — А пасля ліпеня 1998 года страхавым з'яўляецца стаж, за які работнік і работадаўца выплачвалі ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Адпаведна час, калі работнік быў заняты па «шэрай» схеме і калі страхавыя ўзносы не выплачваліся, у такі стаж не ідзе.

І яшчэ адзін нюанс. Заканадаўства вызначае, што пасля 1 ліпеня 1998 года страхавы стаж залічваецца цалкам, калі ўзносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва выплачваліся не менш чым з мінімальнай зарплаты. А за час, калі зарплата была ніжэйшая за «мінімалку», страхавы стаж разлічваецца з папраўачным каэфіцыентам.

Пазней. Або перапынак

Бывае, што агульнаўсталяваны пенсійны ўзрост надышоў, а для атрымання права на працоўную пенсію не хапае ўсяго некалькіх месяцаў страхавога стажу. Ці ёсць тут варыянты?

— У такім выпадку кожны мае магчымасць не афармляць сацыяльную пенсію адразу ж, а проста дапрацаваць неабходныя некалькі месяцаў, — заўважае Ала Колбік. — Або, калі сацыяльная пенсія ўжо аформлена, можна напісаць заяву з просьбай часова прыпыніць яе выплату — і ў перыяд падобнай «паўзы» зноў жа дапрацаваць патрэбны стаж.

Асобныя ўмовы — інвалідам

Асобная гаворка аб інвалідах. Пенсіі па інваліднасці прызначаюцца крыху па іншых правілах — у залежнасці ад стажу працы да часу атрымання групы.

— Заканадаўства вызначае наступныя ўмовы, — адзначае Ала Колбік. — Для атрымання пенсіі па інваліднасці інвалід да дасягнення 23-гадовага ўзросту павінен мець не менш чым 1 год, інвалід ва ўзросце ад 23 да 26 гадоў — не менш чым 2 гады, інвалід ва ўзросце ад 26 да 31 года — не менш чым 3 гады, ва ўзросце ад 31 да 36 гадоў — не менш чым 5 гадоў, ва ўзросце ад 36 да 41 года — не менш чым 7 гадоў, ва ўзросце ад 41 да 46 гадоў — не менш чым 9 гадоў, ва ўзросце ад 46 да 51 года — не менш чым 11 гадоў, ва ўзросце ад 51 да 56 гадоў — не менш чым 13 гадоў, ва ўзросце ад 56 да 61 года — не менш чым 14 гадоў, ва ўзросце звыш 61 года — не менш чым 15 гадоў стажу працы.

Што ж да інвалідаў ва ўзросце да 20 гадоў, якія атрымалі групу падчас працы, прадпрымальніцкай, творчай дзейнасці ці пасля яе спынення, то тут пенсіі прызначаюцца незалежна ад працягласці працоўнага стажу.

Куды прыносіць дакументы?

Звяртацца па сацыяльныя пенсіі, як і па пенсіі працоўныя, неабходна ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы жыхарства. Прычым сюды неабходна прадставіць свой пашпарт або ў выпадку з дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце да 18 гадоў — пашпарт аднаго з бацькоў, апекуна ці папячыцеля, а таксама пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці.

— Плюс да таго калі чалавек хоць які-небудзь час працаваў, то, магчыма, спатрэбяцца ўсе дакументы аб працоўнай дзейнасці, — заўважае Ала Колбік. — І, дарэчы, па гэтыя дакументы трэба звяртацца да ранейшых работадаўцаў.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Административно-хозяйственное здание** Одноэтажное кирпичное здание общ. площадью 265,3 кв.м, земельный участок 0,0733 га	241 925 000	24 192 500

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Железнодорожного района, адрес объекта: **г. Гомель, пер. Строителей, 3.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17.00 18 апреля 2011 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**19 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012029970016 в Филиал ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 334, УНП 102353509
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: 8 (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс), www.bti.by.

**«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.**

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 10 (389)

Не забудзьцеся ў сакавіку...

- **У канцы месяца рыхтуйце грады пад яравы часнок.**
- Вызваліце пасадкі шматгадовых раслін ад мульчы, пастаўце каркас і накрыйце плёнкай: так агароднінныя культуры хутчэй растуць.
- **У першай палове сакавіка высявайце на расаду цыбулю-парэй і цыбулю-чарнушку.**
- У сакавіку высяваюць пад плёнку цыбулю на пяро. У гэтым выпадку выкарыстоўваюць сухое насенне.
- **На градках для ранняга зяленіва правакуюць з'яўленне ўсходаў пустазелля. Градкі паліваюць кіпенем і накрываюць плёнкай. Калі з'явяцца парасткі, укрыццё прыбіраюць і пустазелле гіне ад холаду. Пасля гэтага глебу на градцы капаць не варта, можна толькі рыхліць.**

Дзягіль — і лякарства, і прыправа

Паводле падання, на лекавыя ўласцівасці дзягілю ўказаў анёл. Згодна з легендай, у час чумы Архангел Міхаіл загадаў манахам жаваць корань дзягілю, і, магчыма, таму гэтая хвароба іх мінавала.

Дзягіль — травяністая расліна, якую можна сустрэць на тэрыторыі Еўропы, у Заходняй Сібіры, на Паўночным Каўказе, Урале, непадалёку ад балот, па берагах рэк. У Бельгіі, Францыі дзягілю надаюць заслужаную ўвагу. Яго прымяняюць як агароднінную, лекавую, востра-пахучую і нават як дэкаратыўную расліну. Усе часткі дзягілю маюць прыемны пах, абумоўлены эфірным алеем. Расліна ўтрымлівае мноства пажыўных рэчываў, горкія і дубільныя рэчывы, кальцый і фосфар, аскарбінавую, яблычную, валяр'янавую кіслоты. У кветках утвараецца многа нектару і пылку. Дзягіль — двухгадовая ці шматгадовая расліна. У першы год фарміруе прыкаранёвую разетку лістоў і корань. На другі год адрастаюць лісты і вышынёй да 2 м сцябло чырванавата-фіялетавага колеру, якое вянчаюць суквецці — складаныя парасонікі дыяметрам 10—15 см. Цвіце дзягіль у чэрвені—жніўні. Насенне выспявае ў жніўні і верасні. Дзягіль пераважае на сярэдніх па ўрадлівасці глебах са слабай ці нейтральнай рэакцыяй, любіць сонца, але добра расце і ў зацяненні. Карані расліны першага году жыцця выкопваюць позна ўвосень або на наступны год ранняй вясной. Пры перапрацоўцы трэба асцярожна абыходзіцца з сокам расліны, каб пазбегнуць лёгкіх апёкаў. Гаркаваты смак маладых лістоў і моцны востры пах абумоўліваюць выкарыстанне дзягілю ў якасці прыправы. Насенне і корань прымяняюць для араматызацыі лікёраў. Са свежых каранёў і парасткаў робяць цукаты, пасцілу, сурагат гарбаты. У некаторых краінах Заходняй Еўропы з маладых лістоў гатуюць салаты і гарніры, зяленіва дадаюць у супы. У народнай медыцыне дзягіль выкарыстоўваюць для паляпшэння дзейнасці сэрца, ён знімае спазмы, супакойвае нервовую сістэму, і падаўляе працэсы браджэння ў арганізме. Сок расліны аказвае бактэрыцыднае і спазмалітычнае дзеянне на дыхальныя шляхі. Аказвае станоўчы ўплыў на імунную сістэму, яго прымяняюць пры лячэнні ўсіх рэспіраторных інфекцыйных захворванняў. Алей расліны валодае антысептычнай і мачагоннай уласцівасцю, паляпшае адток лімфы. Яго выкарыстоўваюць як масажны сродак пры артрыце, артрозе, рэўматызме.

Адвар кораня п'юць для павышэння апетыту, пры вяласці страўніка, гастрытах з паніжанай кіслотнасцю. Корань, настояны на гарэлцы, прымяняюць для націранняў пры рэўматызме, ён здымае боль у мышцах.

САЛАТА З ДЗЯГІЛЕМ

Маладыя парасткі дзягілю, ачышчаныя ад скуркі, яблыкі і карэнне сельдэрэю нарэзаць тонкай саломкай, змяшаць і запраўіць маянэзам, дадаць сок палавіны лімона, перац і соль на смак. Зверху пасыпаць кропам і цёртым сырам.

Яны першымі выглядаюць з-пад снегу

Прабіваюцца прама з мёрзлай глебы гэта ў першую чаргу падснежнік, адоніс, крокус, брандушка, пралеска, марознік. Усе яны добра пераносяць холад, пасля замаразкаў іх бутоны здольныя ажываць і працягваць цвісці.

Сярод **марознікаў** раней за ўсіх зацвітае марознік тыбецкі — яго кветканосы з бутонамі прабіваюцца з-пад снегу, калі зямля яшчэ не растала. Кветкі ў яго драбнейшыя, чым у іншых марознікаў, але ў гэтую пару ім няма роўных па прыгажосці. Іх бутоны звернутыя ўверх, калі распускаюцца, то кветкі схіляюцца долу на доўгіх ножках.

Марознік чорны **(на фота)** у Еўропе называюць «каляднай кветкай»: там ён зацвітае на Каляды, у нас жа — пасля таго, як сыдзе снег. Самыя ранніе гатункі звычайна адыходзяць на зіму ўжо з бутонамі, якія зімуюць пад снегам. Існуюць розныя гатункі, у тым ліку і махровыя. Яны адрозніваюцца па вышыні кветканосаў, форме кветак. Пры распусканні кветкі ва ўсіх белыя, у некаторых яны ў далейшым ружавеюць і нават чырванеюць. Эфектна выглядаюць гатункі з пурпуровымі і чырвонымі кветканосамі.

Бутоны **адонісу** амурскага з'яўляюцца на першых прагалінах. Буйныя ярка-жоўтыя бліскучыя кветкі выглядаюць даволі прыкметна для такой пары. Калі свеціць сонца, пялёсткі поўнасцю раскрываюцца, а на ноч закрываюцца. Махровая форма зацвітае крыху пазней, у пачатку мая, і цвіценне ў яе больш працяглае.

У хуткім часе, пасля таго, як сыдзе снег, распускаюцца **пячоначніцы**. Самыя ранніе — азіяцкая і трансільванская, пазней зацвітае пячоначніца высакародная. Асаблівай разнастайнасцю вызначаецца пячоначніца японская — у Японіі налічваюць больш за тысячу гатункаў фантастычнай прыгажосці.

Шчыльныя малюнкі **пралесак** утвараюць сінія, бледна-ружовыя, белыя і фіялетавыя плямы. У падобнай на пралеску пушкініі кветкі больш дробныя, белыя з блакітнай палоскай, ёсць і чыста белая форма.

Кандыкі цвітуць нядоўга. У самых патрабавальных і ўстойлівых сярод ранніх відаў — кандыкоў сібірскага і еўрапейскага — ёсць гатункі з афарбоўкай кветак ад ліловага да белага, у кандыка японскага «чарнільны» малюнак у цэнтры кветкі.

У пачатку мая зацвітаюць белыя і карычневыя формы **рабчыка шахматнага. Медуніца** мяккая з яркімі фіялетава-сінімі завіткамі распускаецца раней за сваіх суродзічаў.

Прымулы ўтвараюць буйныя шапкі — белыя, светла-жоўтыя, бэзавыя, ліловыя, цвітуць яны да трох тыдняў.

Першацветы — гэта і **зубянка жалезістая**, **і двуліснік Грэя, і ветраніца дубраўная, і анеманела васіліснікавая** і многія іншыя — выглядаюць незвычайна і прывабліва сярод веснавой шэрасці, прабіваючыся з-пад мерзлаты, каб мы затрымалі позірк і падзівіліся іх абаянню і прыгажосці. Знайдзіце ў сваім садзе невялічкае месца і пасадзіце іх.

Прафілактыка — справа патрэбная

Вядома, калі на пладовых дрэвах вялікая колькасць шкоднікаў, то без хімічных сродкаў аховы абысціся вельмі складана, але і ў гэтым выпадку можна знайсці кампраміс.

Догляд саду пачынаюць вясной: выразаюць сухія галінкі, залечваюць раны на штамбах дрэў; для аховы ад сонечных апёкаў, а таксама для знішчэння шкоднікаў, якія зімуюць пад карой дрэў, беляць ствалы. Пабелка рыхтуецца наступным чынам: у 10 л вады разводзіцца 1 кг вапны, 3 кг каравяку, 5 кг гліны, 50 г меднага купарвасу або 1 пакецік прэпарата «Хом», 30 г мыла, 2 ст. лыжкі канцылярскага клею,1 ампула «Эпіну» або «Цыркону». Усё старанна перамяшаць, загадзя зачысціць ствалы і вялікія галіны пладовых дрэў і густа іх пабяліць.

У пачатку распускання пупышак мэтазгодна правесці «блакітнае» апырсканне пладовых дрэў ад цэлага комплексу захворванняў 3—4-працэнтным растворам бардоскай вадкасці. Парэчкі і агрэст апырскваюць (100 г меднага купарвасу і столькі ж вапны на 10 л вады), калі кусты моцна паражоныя антракнозам.

Для прафілактыкі і падкормкі раслін пад корань вясной і летам спецыялісты рэкамендуюць «Цыркон».

Калі дрэвы пастаянна паражаюць кляшчы, праводзіцца апырскванне суспензіяй калоіднай серы. Вясной, калі набрыняюць пупышкі і раскрываюцца лісцікі, звычайна расліны падкормліваюць азотам. Аднак залішняе ўнясенне азоту можа справакаваць развіццё мучністай расы. Каб гэтага не здарылася, у прыстольныя кругі дрэў можна дабаўляць попел. Кусты, паражоныя мучністай расой, можна апырснуць настоем каравяку. Для гэтага 1 кг сыравіны заліваюць 3—4 л цёплай вады і пакідаюць на двое сутак. Перад прымяненнем настой разбаўляюць вадой у 3 разы. Добра будзе, калі вы апрацуеце хворыя дрэвы і кусты суспензіяй калоіднай серы (толькі не агрэст, таму што на ім прэпарат серы можа выклікаць апёкі). Гэта апрацоўка дапамагае і ў барацьбе з парэчкавым кляшчом. Можна апырснуць расліны слабым растворам марганцоўкі. Пры апырскванні трэба ўлічыць, што чым вышэй тэмпература паветра, тым ніжэй павінна быць канцэнтрацыя прэпаратаў, інакш могуць быць апёкі.

Для аховы ад хвароб спецыялісты раяць выкарыстоўваць біялагічныя прэпараты на аснове бактэрый, якія вырабляюць антыбіётык, здольны тармазіць развіццё фітапатагенаў. Да такіх прэпаратаў адносяцца «Фітаспарын», «Бактафіт», «Гамаір». Іх прымяняюць супраць мучністай расы на парэчках і агрэсце, паршы і маніліёзу (пладовай гнілі) на семачкавых культурах. Для большай эфектыўнасці праз 10 дзён апрацоўку паўтараюць.

Адразу пасля цвіцення кустоў рэгулярна рыхліце зямлю. Для прафілактыкі ад шкоднікаў пад кожны куст уносьце попел (300 г), сухую гарчыцу і молаты перац (1 ст. лыжку). Прэпаратам «Табазол» рэкамендуецца апыльванне па мокрых кустах ад шкоднікаў, якія грызуць лісты.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.20	18.16	11.56
Віцебск —	6.10	18.06	11.56
Магілёў —	6.11	18.06	11.55
Гомель —	6.07	18.03	11.56
Гродна —	6.36	18.31	11.55
Брэст —	6.36	18.32	11.56

Месяц

Поўня 19 сакавіка.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Васіля, Вячаслава, Герасіма, Данілы, Паўла, Рыгора, Якава.*

К. *Гертруды, Рэгіны, Збігнева, Патрыка, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +2..+4°C	КІЕЎ +8..+10°C	РЫГА -1..+1°C
ВІЛЬНЮС +3..+5°C	МАСКВА -1..+1°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ 0..+2°C

СТОЛ У ЦЭНТРЫ РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Стол з'яўляўся галоўным месцам завіхання гаспадароў падчас падрыхтоўкі і правядзення ўсіх народных і хрысціянскіх свят і прысвяткаў, якія адзначаліся на працягу года. Так, мудрая гаспадыня ведала, што перад святам або ў дзень яго правядзення стол неабходна было выскрабсці дабяла, накрыць бялюткім абрусам-настольнікам і паставіць на яго адпаведныя рытуальныя прадметы, якія мелі ахоўную і прадукцыравальную моц. На стале маглі быць ахвярныя бліны, хлеб, каравай, сальнічка з чацвярговай або велікоднай асвячонай соллю, невялікі посуд з асвячонай на Вадохрышча вадой, у якую апускалі велікоднае яйка. На стале маглі быць і іншыя рытуальныя рэчы, непасрэдна звязаныя са святочнымі падзеямі, напрыклад, галінкі асвячонай вярбы або невялікі ахапак сена, якім усцілалі стол напярэдадні Каляд. Перад адпраўленнем у далёкую дарогу з мэтай перасцярогі ад непрыемных нечаканасцяў, трэба было заручыцца аховай-перасцярогай самага сакральнага месца ў хаце — стала. Той, хто збіраўся ў падарожжа, тройчы цалаваў стол, а пасля вяртання дадому стол дзякавалі тымі ж трыма пацалункамі.

● Гаспадар хаты сядзеў на самым ганаровым месцы — у чырвоным куце, пад абразамі. Калі ў сям'і не было бацькі, яго месца займаў старэйшы жанаты сын. Калі сын быў яшчэ нежанатым, то лідарства ў сям'і належала маці. Па баках ад гаспадара рассаджваліся старэйшыя мужчыны і жанчыны, а за імі — малодшыя члены сям'і.

Строга сачылі за тым, каб за сталом адначасова не сядзела трынаццаць чалавек. Існавала павер'е: той, хто сядзе за святочны стол трынаццатым, можа не перажыць бягучы год.

● Перад пачаткам сяўбы сям'я абавязкова садзілася за стол — сумесны сняданак павінен быў сімвалізаваць дружныя ўсходы, багаты ўраджай і своечасовы яго збор.

● Калі пачыналі будаваць новы дом, то на месца будучага чырвонага кута абавязкова ставілі стол з рознымі прысмакамі.

● На Каляды гаспадыня перавязвала ножкі стала невялікім ланцугом і замыкала замком, каб на ўвесь год «замкнуць» языкі ўсім нядобразычліўцам. У некаторых рэгіёнах лічылі, што падобнае магічнае дзеянне здольна паўплываць на хатнюю жывёлу, якая нідзе не заблудзіць і своечасова будзе вяртацца дадому.

● Сярод беларусаў існуе няпісанае, але абавязковае правіла: калі вы аддаеце свой абедзенны стол суседзям для фарміравання вялікага святочнага або жалобнага стала, то яго абавязкова трэба заслаць чыстым абрусам.

● Звычаёвае права беларусаў забараняла дзецям бегаць вакол стала, таму што трохразовыя абходы вакол яго дазваляліся толькі ў рытуальных сітуацыях: падчас вяселля, на хрэсьбінах, пры ўмове цяжкіх родаў бабка-павітуха тройчы абводзіла вакол стала парадзіху.

● Шырока распаўсюджана прыкмета: калі падчас размовы з хлопцам дзяўчына нечакана абапрэцца на стол, то яна доўга не выйдзе замуж.

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.

Усміхнемся!

Калі ён прапанаваў ёй сустракацца, яна звалілася з крэсла, скакала на ложку, хвілін 15 бегала па кватэры ад шчасця і потым адказала: «Падумаю»...

☺

Дзве сяброўкі.
— З чым булачка?
— З маёй будучай лішняй вагой.

☺

Шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік. Але можна моцна зрэзаць праз печань.

☺

Ідзе мураш па лесе. Насустрач яму яшчарка. Мураш, здзіўлена:
— Вой, а ты хто?
— Я дыназаўр.

— Дык вы ж вымерлі!
— Хлусяць. Хварэлі мы.

☺

Зламалася машына і няма грошай на піва — вось яны, мужчынскія крытычныя дні...

Сардэчна віншуем дарагую дачушку і сястрычку **Марыну Віктараўну МАТУСЕВІЧ** з в. Скрабінка Чэрвеньскага раёна **з 25-годдзем**.

Прымі, Марынка, нашы віншаванні
І пажаданні ўсіх даброт.
Хай явай стануцца жаданні,
Жыццё хай будзе, нібы мёд.

Зычым табе добрага здароўя, дабрабыту, кахання, радасці, удачы і творчага плёну. Няхай твая душа заўсёды будзе цёплай, як летні дзень, і прыгожай, як сад у квецені. Няхай побач з табой будуць толькі добрыя і надзейныя людзі і дораць табе любоў, прыемныя моманты і пяшчотныя словы.

Любячыя цябе мама, тата і Вольга.



Дзве даты

17 сакавіка

Дзень святога Патрыка *— нацыянальнае свята Ірландыі, шырока адзначаецца ва ўсім свеце.*

1961 год — ва ўсіх цэрквах Расійскай імперыі прыхаджанам было зачытана палажэнне аб скасаванні прыгоннага права. Сяляне станавіліся свабоднымі. Адметна, што ў 1937 годзе, у гэты ж дзень, у СССР прыняты закон, які фактычна забараняў сялянам свабоднае перамяшчэнне.

1940 год — на Іваноўскай плошчы Крамля Сталіну быў прадэманстраваны і паказаны ў дзеянні танк Т-34, а ўжо 31 сакавіка, не чакаючы канструктыўнай даводкі, на Харкаўскім паравозабудаўнічым заводзе пачалася яго серыйная вытворчасць. Па агульным прызнанні, гэтая машына прызнана найлепшым сярэднім танкам Другой сусветнай вайны.

Цытата дня:

«Юнак хоча захоўваць вернасць, ды не захоўвае; стары хацеў бы «схадзіць налева», ды не можа».

Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.

ПРАВЕРЦЕ, ХАПІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Біцюк. Пта. Жако. Сказ. Адрына. Сіла. Лангет. Амар. Рўка. Нагата. Канагон. Брас. Нант. Уна. Барык. Сядло. Віно. Абакан. Прыклад. Акот. Кокс. Рада. Асака. Лагунак. Мяса. Гняздо. Атрыбут. **Па вертыкалі:** Бокс. Кіеў. Рубін. Кіпячок. Зала. Сагон. Гаяк. Крык. Дог. Корак. Торк. Сума. Шлюзбыст. Астана. Ані. Гад. Каса. Кагенат. Пакет. Кіно. Аман. «Аса». Атан. Дкар. Брага. Баку. Ток. Анод. Кантар. Ташкент.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ:
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: rek@zvyazda.minsk.by.
ISSN 1990 - 763X
Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33 380. Індэкс 63850.
Зак. № 1263. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12